Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная Партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і Мінскага Абкома КП(б)Б

ГОД ВЫДАННЯ XXIV

№ 58 (6940)

НЯДЗЕЛЯ

9

САКАВІКА

1941 г.

ЦАНА 10 КАП.

Всесоюзная Библиотека имени В. И. Ленина

Сёння ў нумары:

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб узнагароджанні ордэнам Леніна заслужанага дзеяча навукі і тэхнікі акадэміка Галеркіна Б. Г.

Крыніца магутнага росквіту калгаснай вытворчасці.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ: **Я. Гарэлік** — Палепшыць падбор і выхаванне кіруючых калгасных кадраў. **В. Аніскавец** — Калі райком больш глыбока заняўся прадпрыемствам. **А. Шчарбакоў** — У паход за чыстату.

У Народным Камісарыяце Дзяржаўнага Кантролю Саюза ССР.

ДАДЗІМ КРАІНЕ БОЛЬШ ЦЭГЛЫ. **В. Блажэвіч** — Як мы асвоілі праектную магутнасць сушылак. **С. Алісевіч** — Чырвоны сцяг не аддадзім. **А. Аляксеєў** — Здабыча гліны ў зімовых умовах. **Н. Шах** — Вытружаць цэглу трэба ўмець.

АРГАНІЗАВАНА СУСТРЭЦЬ ВЕСНАВУЮ СЯЎБУ. **Н. Ткачоў** — Рэзультаты абураючай бестурботнасці. **Е. Уздзенскі** — Вясна ідзе. **П. Дзянішчык** — Калгас перад вясной.

АРТЫКУЛЫ: **В. Крамер** — Вайна і калоніі.

ЗА РУБЯЖОМ: Вайна ў Еўропе і Афрыцы (дзённік ваенных дзеянняў). — Дзеянні германскай авіяцыі. — Амерыканская дапамога англійскаму суднаходству. — Ваенныя падрыхтаванні ў Індыі. — Пасылка асабістага прадстаўніка Рузвельта ў Англію.

ДАДЗІМ КРАІНЕ БОЛЬШ БУДАЎНІЧЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ!

Увесь совецкі народ, натхнёны рашэннямі XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі і VIII сесіі Вярхоўнага Совета СССР, поўны гордасці за сваю радзіму, ажыццяўляе грандыёзную праграму будаўніцтва новых і расшырэння старых прадпрыемстваў, будаўніцтва палацаў культуры, сталінскіх школ, жылых дамоў і т. д.

Беларуская рэспубліка — неадлучная частка вялікага Совецкага Саюза — у 1941 годзе таксама значна расшырае будаўніцтва прамысловых прадпрыемстваў і іншых аб'ектаў. Толькі па адной Мінскай вобласці на будаўніцтва адпушчана 130 мільёнаў рублёў. Велізарныя сродкі капіталаўкладанняў адпускаюцца і па іншых абласцях рэспублікі.

Вялікая і пачотная задача ўскладаецца на будаўнікоў, на работнікаў прамысловасці будматэрыялаў. За гады сталінскіх пяцігодак будаўнікі заслужылі пахвалу ўсяго совецкага народа за створаныя імі выдатныя фабрыкі і заводы, палацы культуры, школы. У будаўнікоў накапіўся багаты вопыт будаўніцтва выдатных помнікаў сталінскай эпохі. Зараз будаўнікі атрымалі заданне радзімы пабудаваць у 1941 г. новыя заводы, фабрыкі, палацы культуры і т. д. Будаўнікі гарацць жаданнем выканаць дзяржаўны план у сціслыя тэрміны, будаваць хутка і эканомна.

Партыя, таварыш Сталін паставілі перад краінай задачу на працягу бліжэйшых год дагнаць і перагнаць і ў эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны. У святле гэтых гістарычных задач як ніколі паўстала неабходнасць асваення скаبراснога метада будаўніцтва новых прадпрыемстваў. Аўладаць гэтым метадам — надзённая задача будаўнікоў. Для таго каб аўладаць гэтым метадам, неабходна ліквідаваць саматужніцтва, асвоіць і поўнасцю скарыстоўваць механізмы, шырэй разгарнуць вытворчасць будаўнічых матэрыялаў і дэталей. Усё гэта патрабуе карэннага паляпшэння работы Наркамата будаўнічых матэрыялаў.

Вострая і зусім заслужаная крытыка, якой падверглася на XVIII партыйнай канферэнцыі і на VIII сесіі Вярхоўнага Совета СССР недахопы ў рабоце саюзнага Наркамата будаўнічых матэрыялаў, у поўнай меры адносіцца і да рэспубліканскага наркамата і яго трэстаў.

На заводах і фабрыках, падпарадкаваных наркамату і трэстам, яшчэ многа недахопаў, якія тармозяць выкананне дзяржаўных заданняў. Вялікія перапалы паліва, каласальныя страты ад браку, неэканомнае расходаванне электраэнергіі, разбухшыя штаты адміністрацыйна-ўпраўленчага апарата і т. д. — усё гэта павышае сабекошт будаўнічых матэрыялаў, стварае тормазы ў выкананні вытворчых заданняў.

Узяць хоць-бы мінскі цагельны завод № 3. Тут план за люты г. г. выканан на 101,2 проц. Але па сортнасці план не выканан. Замест запланіраваных 25 процантаў прадукцыі першага сорту выпушчана толькі 17,1 процанта. Прычынай гэтаму — нарушэнне тэхналагічнай дысцыпліны. Напрыклад, 6 сакавіка ў прэс была падана мёрзлая гліна. У рэзультаце — брак. Няпоўнасцю скарыстоўваецца вытворчая магутнасць печы. Замест 27 тысяч сюды загружаецца толькі 22 тысячы цаглін. Усе гэтыя недахопы маглі-б быць лёгка пераадолены, калі-б кіраўнікі наркамата, трэста часцей заглядалі на завод, цікавіліся яго работай, дапамагалі ў рабоце. Але гэтага, на жаль, няма.

Для гарадыёзнага будаўніцтва, намечанага планам 1941 года, патрэбна цэгла. Яе трэба даць у дастатковай колькасці і добрай якасці. Для гэтага неабходна навесці большэвіцкі парадак на цагельных заводах: устанавіць цвёрды сутачны графік, захоўваць тэхналагічны рэжым, чыстату ў цэхах, парадак на кар'ерах. Усе гэтыя мерапрыемствы павінны строга спалучацца з узмоцненай падрыхтоўкай да сезона.

Цагельная прамысловасць мае выдатныя кадры стахanаўцаў, інжынерна-тэхнічных работнікаў, добрае абсталяванне. Ёсць усе ўмовы для таго, каб недапускаць, як гэта было ў мінулым годзе, лімітыравання будаўніцтва.

Апрача цэглы будаўніцтву патрэбны і іншыя будаўнічыя матэрыялы: цэмент, вапна, мел, пясок, правій і інш. Яны таксама павінны быць у дастатковай колькасці і добрай якасці. Між тым па выпуску вяжучых матэрыялаў лютаўскі план выканан толькі на 80 процантаў. Такое адставанне зусім не да твару кіраўнікам трэста. Неабходна прыняць усе меры к таму, каб план вяжучых матэрыялаў быў выканан поўнасцю і ў тэрмін. Ніякія «аб'ектыўныя» прычыны, за якімі часамі любяць хавацца кіраўнікі, не будуць прыняты пад увагу. Дзяржаўны план — гэта закон, і ён павінен быць выканан безагаворачна.

Для поўнага забеспячэння патрэб капітальнага будаўніцтва неабходна таксама, каб і мясцпромы ўсур'ёз заняліся пытаннем вытворчасці цэглы, вяжучых матэрыялаў з мясцовай сыравіны. Напрыклад, чаму-б не заняцца пытаннем вытворчасці шлакавых, вапняна-зольных, вапняна-змешаных цэментаў і гідраўлічнай вапны? Своечасовае і практычнае вырашэнне гэтых пытанняў дасць дадатковыя рэсурсы будаўнічых матэрыялаў.

Недахопы ў рабоце прадпрыемстваў будаўнічых матэрыялаў, у будаўніцтве новых аб'ектаў далей не могуць быць цярпімы. Абкомы, гаркомы і райкомы партыі, на тэрыторыі якіх знаходзяцца гэтыя прадпрыемствы і новабудоўлі, павінны ўдзяляць ім самую сур'ёзную ўвагу. Уваходзіць у работу кожнага прадпрыемства, цікавіцца эканомікай будаўніцтва — прамы абавязак кожнага партыйнага кіраўніка. Трэба з усёй большэвіцкай страснасцю і настойлівасцю ўзяцца за выкананне рашэнняў XVIII партыйнай канферэнцыі.

Даць краіне больш цэглы, цэменту, вапны, мелу і іншых будаўнічых матэрыялаў — такі павінен быць дэвіз работнікаў прамысловасці будматэрыялаў.

Паспяховае ажыццяўленне будаўнічай праграмы 1941 года яшчэ больш умацуе гаспадарчую і абаронную магутнасць нашай радзімы.

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР

Аб узнагароджанні ордэнам Леніна заслужанага дзеяча навукі і тэхнікі акадэміка Галеркіна Б. Г.

За выдатныя навуковыя работы ў галіне будаўнічай механікі і тэорыі пругкасці ўзнагародзіць заслужанага дзеяча навукі і тэхнікі акадэміка **Галеркіна Барыса Грыгор'евіча**, у сувязі з 70-годдзем з дня нараджэння, **ордэнам Леніна.**

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль. 7 сакавіка 1941 г.

Дэлегацыя беларускага народа вярнулася з Грузіі

7 сакавіка ў Мінск вярнулася дэлегацыя беларускага народа, якая прымала ўдзел ва ўрачыстасцях, прысвечаных 20-годдзю брацкай Грузінскай ССР. У гутарцы з карэспандэнтам БЕЛТА член дэлегацыі народная артыстка Саюза ССР Л. П. Александроўская паведаміла:

— Святкаванне 20-годдзя Грузінскай ССР ператварылася ў яркую дэманстрацыю сталінскай дружбы народаў Совецкага Саюза. Дні, праведзеныя намі ў сонечнай Грузіі, назаўсёды астануцца ў памяці незабыўным радасным успамінам.

Наша дэлегацыя вінпавала працоўных Грузіі і перадала Вярхоўнаму Совету Грузінскай ССР ад беларускага народа падарункі — лепшыя работы калгасных вышывальшчыц, вырабы шклозаводаў, радыёпрыёмнікі мінскага радыёзавода.

27 лютага мы наведалі старажытны горад Горы — радзіму вялікага правадыра народаў таварыша Сталіна. З хваляваннем і любоўю аглядалі мы маленькі домік, дзе нарадзіўся Іосіф Вісарыёнавіч.

Пасля наведання Батумі, дзе мы дэтальна азнаёміліся з месцамі рэволюцыйнай дзейнасці таварыша Сталіна, мы вярнуліся ў сталіцу Грузіі, а адтуль у Мінск.

Праважаючы нас, кіраўнікі партыйных і совецкіх арганізацый Грузіі прасілі перадаць гарачае брацкае прывітанне ад імені грузінскага народа працоўным Беларускай ССР і пажадалі далейшай плённай работы на карысць соцыялістычнай радзімы. (БЕЛТА).

Урачыстыя сходы, прысвечаныя Міжнароднаму жаночаму дню

ВІЦЕБСК, 8 сакавіка. (БЕЛТА). Сёння ў Доме партыйнай асветы адбыўся ўрачысты сход прадстаўнікоў партыйных, совецкіх, комсамольскіх і профсаюзных арганізацый, прысвечаны Міжнароднаму комуністычнаму жаночаму дню. У яркa асветленай і святочна ўпрыгожанай зале прысутнічаюць знатныя жанчыны горада — урачы, інжынеры, навуковыя работнікі, лепшыя стахanаўкі прамысловасці і транспарта, удзельніцы гераічных баёў з белафінамі.

Доўга не змаўкаючай авацыяй сустрэлі ўдзельнікі схода прапанову аб выбранні ў пачотны прэзідыум схода Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з таварышам Сталіным.

З дакладам аб дні 8 сакавіка выступіла сакратар Першамайскага райкома КП(б)Б тав. Лондан.

З вялікім уздымам удзельнікі схода прынялі тэкст прывітальнага пісьма правадыру народаў — вялікаму Сталіну.

***

МАГІЛЕЎ, 8 сакавіка. (БЕЛТА). Сёння ў памяшканні Дома партыйнага актыва адбыўся ўрачысты сход партыйнага, комсамольскага, совецкага і профсаюзнага актыва горада, прысвечаны Міжнароднаму комуністычнаму жаночаму дню. Пад гром апладысментаў у пачотны прэзідыум схода выбіраецца Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з таварышам Сталіным.

З дакладам аб Міжнародным комуністычным жаночым дні выступіла сакратар Магілеўскага гаркома партыі тав. Путырская. З вялікім уздымам удзельнікі схода паслалі прывітальнае пісьмо арганізатару соцыялістычных перамог — таварышу Сталіну.

Пасля ўрачыстай часткі для ўдзельнікаў схода сіламі дзіцячай і жаночай мастацкай самадзейнасці быў дан вялікі канцэрт.

КРЫНІЦА МАГУТНАГА РОСКВІТУ КАЛГАСНАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ

★

ЗБЫЛАСЯ МАРА НАРОДА

(Гутарка з сакратаром Пінскага абкома КП(б)Б т. Мінчанка)

Радасная вестка пра пастанову СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб асушэнні балот у Беларускай ССР маланкай абляцела сёлы і гарады Піншчыны. Чытаючы гэтую гістарычную пастанову, кожны селянін яшчэ раз пераконваецца, што толькі комуністычная партыя і совецкі ўрад сапраўды клапоцяцца аб працвітанні края, навекі вызваленага ад акоў капіталізма.

Вялікія пінскія балоты набылі сусветную вядомасць, як рассаднікі галечы, хвароб і бездарожжа. На дзесяткі і сотні кілометраў цягнуцца яны ўдоўж і ўпоперак. Аднак, за асушку іх не жадалі брацца ні царскі ўрад, ні бяздарныя правіцелі былой панскай Польшчы.

Толькі пры совецкай уладзе сяляне вызваленых абласцей смела загаварылі аб ператварэнні балот ва ўраджайныя палі і сенажаці. 8 студзеня 1941 года калгаснікі сельгасарцелі імені 17 верасня, Жабчыцкага раёна, пісалі ў сваім пісьме да ўсіх калгаснікаў Піншчыны:

«Зямля ў нас не вельмі ўраджайная. Але ў нашых руках ёсць і сілы, і сродкі для ўздыму ўраджайнасці спустошаных палёў і забалочаных сенажацей. Мы павінны прымусіць спрадвечныя палескія балоты, якія агарнулі нашу вёску з усіх бакоў, служыць свабоднаму совецкаму чалавеку і даваць багатыя ўраджаі зернавых культур і сеяных траў.

Мы падлічылі свае сілы і магчымасці і прышлі да высновы, што ў гэтым годзе зможам асушыць у сябе не менш 120 гектараў балота. Для гэтага мы створым меліяратыўныя брыгады, якія адразу пасля веснавой сяўбы выйдуць на масавую асушку балот і ачыстку іх ад хмызняку».

Калгаснікі сельгасарцелі імені 17 верасня першымі ў вобласці яшчэ ў мінулым годзе асушылі 50 гектараў балота, на якіх сёлета атрымаюць высокія ўраджаі проса і іншых культур.

На заклік жабчыцкіх калгаснікаў адгукнуліся калгаснікі Іванаўскага, Драгічанскага і Пінскага раёнаў. 70-гадовы селянін Іванаўскага раёна, стаханавец будаўніцтва Дняпра-Бугскага канала тав. Маркевіч нядаўна па злёце стаханаўцаў сказаў:

«Вякамі мы поўзалі па дрыгве, плавалі на чоўнах. Толькі цяпер ступілі мы на асушаную ўраджайную зямлю, толькі цяпер збываецца адвечная мара сялян беларускага Палесся».

У гістарычнай пастанове СНК СССР і ЦК ВКП(б) прадугледжваецца асушэнне ў басейне Дняпра-Бугскага канала і ў вярхоўях Прыпяці і Нёмана 321.000 гектараў балот. Звыш 10 тысяч гектараў будзе асушана ўжо ў гэтым годзе.

Сяляне Піншчыны з радасцю сустрэлі гэта гістарычнае рашэнне. Разам з усім калгасным сялянствам Беларусі яны выйдуць вясной на масавую асушку балот і ператвораць іх ва ўраджайныя калгасныя палі і сенажаці.

Пачалася падрыхтоўка

ПРАПОЙСК. Адабраючы пастанову Соўнаркома СССР і ЦК ВКП(б) «Аб асушэнні балот у Беларускай ССР і скарыстанні асушаных зямель калгасамі для расшырэння пасеўных плошчаў і сенажацей», калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі імені Будзённага рашылі асушыць і асвоіць у гэтым годзе 80 гектараў балот і забалочаных зямель.

Усяго ў Прапойскім раёне ў гэтым годзе намечана асушыць 600 гектараў балот і 150 гектараў забалочаных зямель. Адначасова з заканчэннем рэгуляроўкі ракі Крупка будуць прарыты каналы даўжынёй у 15 кілометраў.

Калгаснікі раёна, абмеркаваўшы рашэнне СНК СССР і ЦК ВКП(б), пачалі дзейную падрыхтоўку да асушкі і асваення балот. Загатаўляюцца лапаты і іншы інвентар. (БЕЛТА).

★★★

Сталінская праграма ўздыму сельскай гаспадаркі Беларусі

(Гутарка з наркомам земляробства БССР тав. І. А. Крупеня)

Беларускі народ з вялікім натхненнем сустрэў пастанову Соўнаркома СССР і ЦК ВКП(б) «Аб асушэнні балот у Беларускай ССР і скарыстанні асушаных зямель калгасамі для расшырэння пасеўных плошчаў і сенажацей». Пастанова партыі і ўрада з'яўляецца велізарнай сталінскай праграмай далейшага росквіту калгаснага ладу, яркім доказам няспынных клопатаў партыі, урада і асабіста таварыша Сталіна аб беларускім народзе. Пастанова намячае ў бліжэйшыя 15 год асушыць і асвоіць 4 мільёны гектараў балот і забалочаных зямель.

Толькі ў бліжэйшыя 7 год будзе асушана 1.600 тысяч гектараў балот. З іх у бягучым годзе — 100 тысяч гектараў, амаль столькі, колькі асвоена за ўсе папярэднія годы. Для выканання гэтага плана совецкі ўрад і ЦК нашай партыі аказваюць беларускаму народу велізарную дапамогу. Адпушчана каля 600 мільёнаў рублёў, у 1941—1943 гг. арганізоўваюцца 30 новых спецыяльных МТС і 90 машынна-меліяратыўных атрадаў, завозіцца многа экскаватараў, землясосаў, аўтамашын, балотных плугоў і боран.

У мінулым годзе калгасы многіх раёнаў значна перавыкналі план асушкі балот. Калгаснікі Палесся асушылі 18 тысяч гектараў замест плана 10 тысяч. Калгасы Любаньскага, Васілевіцкага і іншых раёнаў рэспублікі за апошнія годы дзякуючы меліярацыі на многа павысілі ўраджайнасць палёў.

Значная работа праведзена па падрыхтоўцы да асушкі балот у гэтым годзе. У Даманавіцкім раёне ў соцыялістычнае спаборніцтва на лепшую работу па асушэнню балот уключылася больш 50 калгасаў. Сельскагаспадарчая арцель «Комінтэрн» правяла падрыхтоўчыя работы для асушкі 222 гектараў балот, калгас «Авангард» абавязаўся асушыць 319 гектараў. У гэтым раёне праведзена ўжо раскарчоўка сотні гектараў балот. Асноўныя трасы разбіты на ўчасткі, якія ўзначальваюцца начальнікамі і паліткіраўнікамі з раённага партыйнага і совецкага актыва. Такая-ж работа праведзена ў Парыцкім, Стрэшынскім і іншых раёнах.

Многія калгасы распрацавалі канкрэтныя графікі работ, выдалучылі брыгадзіраў, рыхтуюць інвентар. На раённых кароткатэрміновых курсах падрыхтавана больш 300 брыгадзіраў па меліярацыі.

Але ўсё, што зроблена да гэтага часу, гэта толькі пачатак той грандыёзнай работы, якая павінна быць праведзена ў гэтым годзе па выкананню важнейшай народнагаспадарчай задачы, пастаўленай перад намі партыяй і ўрадам. Зямельныя органы, спецыялісты па меліярацыі павінны неадкладна забяспечыць, каб кожны калгас канкрэтна ведаў аб'ём яго работы і графік выканання.

Пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый калгаснікі Беларусі яшчэ раз паказваюць згуртаванасць вакол партыі большэвікоў і з поспехам выканаюць сталінскі план вялікіх работ.

Калгаснікі вітаюць гістарычную пастанову партыі і ўрада

МАГІЛЕЎ. **(Па тэлефону).** Калгасы Магілеўскай вобласці з вялікім адабрэннем сустрэлі пастанову СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб асушэнні балот у Беларускай ССР і скарыстанні асушаных зямель калгасамі для расшырэння пасеўных плошчаў і сенажацей». Пастанова партыі і ўрада з'яўляецца велізарнай сталінскай праграмай далейшага росквіту калгаснага ладу, яркім доказам няспынных клопатаў партыі, урада і асабіста таварыша Сталіна аб беларускім народзе. Пастанова намячае ў бліжэйшыя 15 год асушыць і асвоіць 4 мільёны гектараў балот і забалочаных зямель.

Толькі ў бліжэйшыя 7 год будзе асушана 1.600 тысяч гектараў балот. З іх у бягучым годзе — 100 тысяч гектараў, амаль столькі, колькі асвоена за ўсе папярэднія годы. Для выканання гэтага плана совецкі ўрад і ЦК нашай партыі аказваюць беларускаму народу велізарную дапамогу. Адпушчана каля 600 мільёнаў рублёў, у 1941—1943 гг. арганізоўваюцца 30 новых спецыяльных МТС і 90 машынна-меліяратыўных атрадаў, завозіцца многа экскаватараў, землясосаў, аўтамашын, балотных плугоў і боран.

У мінулым годзе калгасы многіх раёнаў значна перавыкналі план асушкі балот. Калгаснікі Палесся асушылі 18 тысяч гектараў замест плана 10 тысяч. Калгасы Любаньскага, Васілевіцкага і іншых раёнаў рэспублікі за апошнія годы дзякуючы меліярацыі на многа павысілі ўраджайнасць палёў.

Калгас «Зара» з плошчы ў 7 гектараў сабраў з гектара па 36 цэнтнераў сырых карэнняў кок-сагыза.

Значных поспехаў у асушэнні і асваенні балот дабіўся калгас імені Будзённага, Пранойскага раёна. Калгаснікі гэтай сельгасарцелі за апошні год асушылі 140 гектараў і асвоілі 77. Звяно тав. Пінчанка з плошчы ў 5 гектараў атрымала па 38 цэнтнераў зернавых.

Асабліва вялікія работы па асушцы і асваенню балот будуць праведзены ў гэтым годзе. У Пранойскім раёне ў пойме ракі Ваўчанкі, дзе будзе працаваць экскаватар, намячаецца асушыць 2 тысячы гектараў балот, у Бялыніцкім раёне — тысячу і т. д.

Калгаснікі абавязваюцца па асушаных і асвоеных балотах атрымаць высокія ўраджаі ўсіх культур.

Расце энтузіязм калгасных мас

(Гутарка з сакратаром Даманавіцкага РК КП(б)Б т. Дагура)

Балоты займаюць амаль палавіну ўсіх зямель нашага раёна. Рашучае наступленне на балоты калгаснікі раёна пачалі ў мінулым годзе. Летась намі асвоена 1.500 гектараў балот — у 4 разы больш, чым за ўсе папярэднія годы. На асвоеных землях калгаснікі атрымліваюць высокія ўраджаі. Сельскагаспадарчая арцель «Ленінскі шлях» сабрала па 21 цэнтнеру жыта з гектара, па 37 цэнтнераў аўса, 180 цэнтнераў бульбы і больш чым па 100 цэнтнераў сена. У рэзультаце кошт прадукта калгаснікаў павялічыўся ў 2,5 раза. Поўнасцю ліквідавана бяскормица жывёлы. Такіх-жа рэзультатаў дабіліся і іншыя калгасы.

На гэты год нам запланіравана асушыць 2.665 гектараў балот. У раёне праведзена значная падрыхтоўка да меліяратыўных работ. Раскарчавана і падрыхтавана да асушкі 700 гектараў балот. Усе калгасы раёна прымацаваны да пэўных вытворчых участкаў. У кожным калгасе складзен канкрэтны графік работ.

Але даведзены план не задаволіў калгасы раёна. Яны не раз ставілі пытанне аб расшырэнні аб'ёму работ па асваенню новых зямель.

Пастанова партыі і ўрада «Аб асушэнні балот у Беларускай ССР і скарыстанні асушаных зямель калгасамі для расшырэння пасеўных плошчаў і сенажацей» ідзе насустрач патрабаванням калгаснікаў. Уключэнне ў план меліярацыі басейна ракі Вішы дае магчымасць асушыць дадаткова каля 2.000 гектараў забалочаных зямель. Калгасы «Чырвоны ўсход» і «Пяцігодка», якія знаходзяцца ў гэтым басейне, абавязаліся асушыць па 150—180 гектараў.

Пастанова партыі і ўрада выклікала новы ўздым вытворчай актыўнасці калгаснікаў. Паўсямесна разгарнулася падрыхтоўка інструментаў і іншага інвентара. Звыш 100 агітатараў прыступілі да раз'яснення калгаснікам пастановы партыі і ўрада. Калгаснікі бязмерна ўдзячны партыі і ўраду, вялікаму Сталіну за клопаты аб далейшым росквіце калгаснай вёскі. Энтузіязм калгасных мас з'яўляецца вернай зарукай таго, што сталінская праграма асушэння балот будзе з чэсцю выканана.

СХОД ПАРТЫЙНАГА АКТЫВА МАГІЛЕВА

МАГІЛЕЎ. **(Кар. «Звязды»).** 6—7 сакавіка праходзіў сход партыйнага актыва гор. Магілева з удзелам сакратароў райкомаў партыі вобласці. З дакладам аб выніках XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі выступіў делегат канферэнцыі — сакратар абкома КП(б)Б тав. Макараў.

Дакладчык адзначыў некаторыя поспехі ў рабоце прамысловасці вобласці. Аб'ём валавой прадукцыі дзяржаўнай прамысловасці і промкааперацыі ў 1940 годзе складае 219.034,5 тысячы рублёў — рост на 18 проц. супроць 1939 года. 24 прадпрыемствы датэрмінова выканалі гадавы план, даўшы дзяржаве звыш плана на 4,5 мільёна рублёў прадукцыі.

Аднак у рабоце прамысловасці ёсць многа істотных недахопаў. Многія прадпрыемствы горада ўсё яшчэ не ў стане пакончыць з парочным стылем у рабоце — штурмаўшчынай. Магілеўскі сушыльны камбінат, напрыклад, план за студзень выканаў на 101,5 проц., прычым праграма першай дэкады была выкананa ўсяго на 9,4 проц. Скурзавод імені Сталіна і клеевы завод не выконваюць плана па асартыменту і сортнасці прадукцыі. Яны выпрацоўваюць тое, што ім лягчэй і больш выгадна.

Асаблівую ўвагу тав. Макараў удзяліў у сваім дакладзе пытанню кіраўніцтва работай прамысловасці. Партыйныя арганізацыі не ўваходзілі ў сутнасць вытворчасці, — наспех і павярхоўна вырашалі пытанні, не аналізіравалі прычыны дрэннай работы прадпрыемстваў.

Партыйнае бюро шоўкавай фабрыкі імені Куйбышэва многа разоў абмяркоўвала пытанне аб дрэннай рабоце ЦЭЦ. Вынесена 8 рашэнняў, але ні адно з іх не выканала. Партыйнае бюро не знаходзіла сапраўдных прычын недахопаў. ЦЭЦ паранеўшаму перашкаджае рабоце фабрыкі, зрывае вытворчыя планы суседніх прадпрыемстваў — скурзавода і клеевага завода, пакідае іх без пару і электраэнергіі.

Па дакладу разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі. Выступіла 17 чалавек.

Сакратар партарганізацыі Магілеўскага металакамбіната тав. Іофе раскасаў аб тым, што завод узяўся асвоіць многія новыя віды прадукцыі, але рабіў гэта без плана, непрадумана. Доўгі час вазіліся з асваеннем мясарубкі, патрацілі многа сродкаў, а справу да канца не давялі.

Тав. Іофе падвергнуў рэзкай крытыцы работу інструктара гаркома тав. Гушанскага, які заходзіць на прадпрыемства за весткамі, але не ўваходзіць у жыццё вытворчасці, не дапамагае партыйнай арганізацыі.

Тав. Бельскі (палітадзел чыгункі) гаварыў аб адарванасці палітадзелаў ад тэрытарыяльных партыйных арганізацый горада. Многія прадпрыемствы горада заплацілі вялікія штрафы за прастой вагонаў, а партыйныя арганізацыі не ўмешваліся ў гэтую справу і не прыцягвалі вінаватых да адказнасці.

Сакратар Магілеўскага гаркома КП(б)Б тав. Хаўкін у сваім выступленні ўдзяліў асаблівую ўвагу пытанню падбору і правільнай расстаноўкі кіруючых кадраў прадпрыемстваў.

Бурнымі апладысментамі была сустрэта прапанова аб пасылцы прывітальнага пісьма правадыру народаў таварышу Сталіну.

Партыйны актыў прыняў канкрэтную пастанову аб рэалізацыі рашэнняў XVIII партыйнай канферэнцыі, патрэбаваў ад кіраўнікоў прадпрыемстваў і партыйных арганізацый у найкарацейшы тэрмін ліквідаваць штурмаўшчыну і забяспечыць раўнамерную работу прадпрыемстваў. Актыў прапанаваў кіраўнікам тых прадпрыемстваў, якія не выканалі план у студзені і лютым, пакрыць запазычанасць перад краінай.

Выканалі квартальны план загатовак і вывазкі лесу

ПІНСК, 8 сакавіка. **(Кар. «Звязды»).** Пінскі раён першым у вобласці датэрмінова выканаў квартальны план загатовак і вывазкі лесу. На 7 сакавіка ў раёне загатоўлена 32 тыс. кубаметраў драўніны, або 106,6 проц. плана, вывезена 35.400 кубаметраў — 101 проц. плана.

***

УЗДА, 8 сакавіка. **(Па тэлефону).** Ажыццяўляючы рашэнні XVIII партканферэнцыі, працоўныя Уздзенскага раёна датэрмінова выканалі план загатовак і вывазкі лесу. Загатоўлена 53.337 кубаметраў драўніны, або 102,4 проц. плана, вывезена 44.058 кубаметраў драўніны, або 100,2 процанта. Работа па загатоўцы і вывазцы лесу прадаўжаецца.

Сакратар райкома КП(б)Б ЭЛЬПЕР.
Старшыня райвыканкома КАСЦЮК.
Дырэктар леспрамгаса РЭЙДЭР.

Прыезд нарвежскай гандлёвай дэлегацыі

7 сакавіка ў Маскву прыбыла нарвежская гандлёвая дэлегацыя ў саставе: Міністра Гандлю Нарвегіі п. Іоганесен, Члена Праўлення Нарвежскага Дзяржаўнага банка п. Лалум і Генеральнага Консула п. Ванаг.

На Беларускім вакзале дэлегацыю сустракалі: Член Калегіі Наркамзнешгандлю і Начальнік Аддзела Гандлёвых Дагавораў НКЗГ СССР тав. Д. Д. Мішусцін, Нам. Гандлёвага прадстаўніцтва СССР у Нарвегіі тав. Д. М. Майсеєў, Пам. Нач. Пратакольнай Часткі НКЗГ СССР тав. А. К. Паўленка, а таксама Саветнік Германскага Пасольства ў Маскве п. Гільгер і Член Нарвежскай Гандлёвай Дэлегацыі п. Альбрэхт, прыбыўшы ў Маскву 6 сакавіка.

Партыйнае жыццё

Палепшыць падбор і выхаванне кіруючых калгасных кадраў

Партыя большэвікоў і асабіста тав. Сталін не раз падкрэслівалі значэнне правільнага падбору і вырашчвання калгасных кадраў для развіцця і ўздыму сацыялістычнай сельскай гаспадаркі.

За гады сацыялістычнага пераўтварэння вёскі ў Магілеўскай вобласці вылучана і вырашчана вялікая колькасць кіруючых калгасных кадраў, добрых арганізатараў і кіраўнікоў калгаснай гаспадаркі.

64 перадавікі сельскай гаспадаркі вобласці ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі, з іх 11 старшынь калгасаў. У 1939 годзе ўдзельнікамі Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі было 18 старшынь калгасаў, а ў 1940 годзе — 146.

Многія старшыні калгасаў працуюць доўгі час і авалодалі майстэрствам кіраўніцтва складанай калгаснай гаспадаркай. 727 старшынь сельгасарцелі працуюць ад 2 да 5 год, 257—ад 5 да 10 год і больш. Ёсць такія старшыні, якія працуюць з дня арганізацыі калгасаў. Напрыклад, тав. Спефанцоў І. В. — старшыня сельгасарцелі «Праўда», Старасельскага сельсавета, Мсціслаўскага раёна — кіруе калгасам з 1929 года; тав. Школьнікаў А. В. — старшыня сельгасарцелі «Чырвоная зорка», Рудкоўскага сельсавета, Горацкага раёна, — на гэтай пасадзе з 1931 года; тав. Карчэўскі А. Ф. з'яўляецца старшынёй калгаса «Комуніст», Селібскага сельсавета, Бярэзінскага раёна, з 1930 года.

Як правіла, тыя калгасы, дзе старшыні працуюць доўгі час, з'яўляюцца найбольш моцнымі арганізацыйна і гаспадарча, своечасова і добраякасна спраўляюцца са сваімі гаспадарчымі задачамі і акуратна выконваюць свае абавязацельствы перад дзяржавай.

Партыйная арганізацыя вобласці правяла значную работу па вырашчванню кіруючых калгасных кадраў, пашырэнню іх палітычнага кругазору, падняццю іх агратэхнічных ведаў. За 1940 год прапушчана праз кароткатэрміновыя курсы, арганізаваныя ў раённых цэнтрах, 2.051 старшыня калгаса, 3.879 брыгадзіраў. У гэтым годзе вучоба старшынь калгасаў пралаўжаецца.

Аднак трэба падкрэсліць, што асноўная маса старшынь — людзі, прышоўшыя да кіраўніцтва нядаўна, у 1939—1940 гг. Іх налічваецца 1.762 чал., што складае 64 проц. агульнага ліку старшынь калгасаў. Мы яшчэ не дабіліся замацавання гэтых кадраў, і да гэтага часу мае месца празмерная цякучасць.

З 2.746 старшынь калгасаў змянілася ў 1939 годзе 1.059 чал., або 39 проц., у тым ліку знята 400 чал. За 1940 год змянілася 738 чалавек, або 27 проц., з ліку іх знята 423 чалавекі.

У 1939 годзе ў 90 калгасах змянілася па два старшыні і ў 29 — па тры старшыні. У 1940 годзе па два старшыні змянілася ў 90 калгасах і па тры—у 9-ці.

Такое становішча тлумачыцца нездавальняючай работай аддзелаў кадраў РК і адпаведных совецкіх і зямельных органаў.

Многія партыйныя, совецкія і зямельныя органы да гэтага часу несур'ёзна падыходзяць да падбору кіруючых кадраў. Ёсць нямала выпадкаў, калі старшынямі калгасаў рэкамендуюцца людзі выпадковыя, няздольныя забяспечыць справу, а часам нават чужыя нам.

З ведама Чавускага райза старшынёй калгаса «Чырвоны араты» быў выбран у студзені 1940 года нейкі Данілаў. У 1937 годзе за развал гэтага-ж калгаса, за разлажэнне працоўнай дысцыпліны ён быў знят з пасады старшыні, выключан з партыі і аддан пад суд.

Да гэтага часу не ліквідавана практыка знятця з работы старшынь калгасаў без ведама райкома партыі і райвыканкома. Пры гэтым груба нарушаецца калгасная дэмакратыя.

Старшыня Сухараўскага сельсавета, Чавускага раёна, тав. Грамыка самавольна, без ведама РК КП(б)Б і райвыканкома, змяніў у 1940 годзе чатырох старшынь калгасаў. Старшыня Самулкоўскага сельсавета тав. Ісакоў самачынна змяніў трох старшынь калгасаў.

У Кіраўскім раёне меў месца факт, калі ўпаўнаважаны райкома настаўнік Петрушка зняў з работы старшыню калгаса «Праца».

Ёсць многа выпадкаў пасылкі старшынямі калгасаў людзей, якія не апраўдалі сябе на гэтай рабоце, аказаліся няздольнымі кіраўнікамі, абанкроціліся.

Кажамякін у 1937 годзе працаваў старшынёй калгаса «1 мая», Жаліўскага сельсавета, Чавускага раёна, і за безгаспадарчасць і пакражы быў знят з работы і асуджан на 3 годы турэмнага зняволення. Пасля адбыцця тэрміну пакарання ён зноў працуе старшынёй аднаго з калгасаў Жаліўскага сельсавета. Там Кажамякін прапрацаваў 6 месяцаў і быў знят з работы, бо не справіўся з ёю. Следам за гэтым старшыня Жаліўскага сельсавета т. Комар аформіў Кажамякіна старшынёй калгаса «Перамога», дзе ён зноў праваліў работу арцелі.

Такія прыклады можна было-б прывесці і па іншых раёнах вобласці.

Сур'ёзным недахопам работы партыйных і совецкіх органаў з'яўляецца адсутнасць сістэматычнай палітычна-выхаваўчай работы са старшынямі калгасаў. Іх сабіраюць ад выпадку да выпадку і, як правіла, па пытаннях бягучых гаспадарчых задач. Семінары са старшынямі калгасаў па палітычных, агратэхнічных і іншых пытаннях не праводзяцца.

Абкомам КП(б)Б быў абследаван рад раёнаў (Чавускі, Клімавіцкі і інш.) спецыяльна па пытанню падбору і выхавання старшынь калгасаў. Прыняты канкрэтныя меры да замацавання калгасных кадраў і палепшання палітыка-выхаваўчай работы сярод іх. У рэзультаце — за апошні час справа падбору і замацавання калгасных кадраў палепшылася. Аднак недахопаў яшчэ многа. У гэтай справе нашы партыйныя арганізацыі павінны грунтоўна і многа папрацаваць.

Я. ГАРЭЛІК,
сакратар Магілеўскага абкома КП(б)Б.

КАЛІ РАЙКОМ БОЛЬШ ГЛЫБОКА ЗАНЯЎСЯ ПРАДПРЫЕМСТВАМ

У святле рашэнняў XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі робяцца асабліва яснымі прычыны нездавальняючай работы раду прадпрыемстваў нашага Глыбоцкага раёна. Райком партыі павярхоўна кіраваў прамысловасцю, глыбока не ўваходзіў у яе работу.

Побач з прадпрыемствамі абласной і раённай прамысловасці ў нас ёсць адно прадпрыемства рэспубліканскага падпарадкавання—мясакамбінат. Нельга сказаць, што райком партыі не займаўся ім: на працягу мінулага года тры разы на пасяджэнні бюро райкома абмяркоўвалася пытанне аб рабоце камбіната. Заслухоўвалі на пасяджэнні бюро райкома даклад дырэктара камбіната тав. Кручкова аб прычынах невыканання плана, перарасходу сродкаў і іншых недахопах. Аднак своечасовай і канкрэтнай дапамогі, каб папярэдзіць недахопы і гэтым самым забяспечыць рытмічную і планамерную работу, райком не аказваў. Больш таго, мы часта адрывалі дырэктара прадпрыемства ад яго непасрэднай работы для пасылкі на вёску па правядзенню розных гаспадарча-палітычных кампаній. На прадпрыемстве стваралася абязлічка.

Само кіраўніцтва камбіната не паклапацілася аб умацаванні аўтарытэта і павышэнні ролі майстроў.

Двор і цэхі камбіната знаходзіліся ў антысанітарным стане. У цэхах на падлозе валяўся збой. У тлушчавым цэху капёл і машына са знешняга боку ніколі не чысціліся. Шпагат, які прызначан для перавязкі каўбас, валяўся на мокрай, друднай падлозе.

Усе гэтыя агіднасці выкрытыя райкомам партыі толькі зараз, у час вывучэння ў калектыве камбіната рашэнняў XVIII партыйнай канферэнцыі. Выявілася, што па камбінаце разбазарвалася мяса, транжыраваліся дзяржаўныя сродкі. Райком партыі зараз прыняў меры па аздараўленню абстаноўкі на камбінаце. Прайдзісветы, якія пралезлі на прадпрыемства і разбазаравалі соцыялістычную ўласнасць, адданы суду. Нягодныя работнікі замяняюцца праверанымі, здольнымі таварышамі.

На камбінаце днямі арганізавана комсамольская арганізацыя, якая павяла дзейсную барацьбу за культуру і чыстату. Цэхі камбіната ўжо прынялі зусім іншы выгляд. Абсталяванне, рабочае месца ўтрымліваюцца рабочымі ў належным парадку.

Гэта толькі частка работы. Галоўнае—нам неабходна забяспечыць планамерную работу ўсіх прадпрыемстваў для выканання плана без рыўкоў і штурмаўшчыны, як гэтага патрабуюць рашэнні XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі.

В. АНІСКАВЕЦ,
сакратар Глыбоцкага райкома партыі.

У НАРОДНЫМ КАМІСАРЫЯЦЕ ДЗЯРЖАЎНАГА КАНТРОЛЮ САЮЗА ССР

Наркамат Дзяржаўнага Кантролю Саюза ССР правёў у Куйбышэўскай і Курскай абласцях, Орджанікідзеўскім краі і ў Наркамземе СССР рэвізію ўліку, хавання і расходавання гаручага, прызначанага для сельскагаспадарчых работ.

I

Рэвізіяй расходавання гаручага ў машынна-трактарных станцыях Куйбышэўскай вобласці ўстаноўлена, што многія МТС вобласці не выконваюць пастановы Соўнаркома СССР ад 1 лютага 1931 года № 85 і Эканомсавета пры СНК СССР ад 21 лютага 1940 года № 268, якія забараняюць расходаваць не па прамому прызначэнню гаручае, прызначанае для сельскагаспадарчых работ. У 107 МТС вобласці за дзевяць месяцаў 1940 года адпушчана розным арганізацыям і прыватным асобам 551,9 тоны гаручага, у тым ліку 282,8 тоны бензіна. Апрача таго, начальнік аблземаддзела Цыганаў В. С. і яго намеснік Касцянаў П. А. у 1940 годзе за кошт лімітаў МТС незаконна адпусцілі аблвыканкому, аблжылснабу, аблтопснабзбыту, горсовету і іншым установам 100,5 тоны гаручага.

Выканком Куйбышэўскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных замест таго, каб устанавіць кантроль за правільным скарыстаннем гаручага, сам даваў незаконныя распараджэнні аблземаддзелу аб водпуску гаручага розным арганізацыям у лік лімітаў МТС. Па распараджэнню старшыні аблвыканкома Жураўлёва Н. Н. у 1940 годзе абласны зямельны аддзел адпусціў Куйбышэўскаму горсовету 3 тоны ліграіна і для раённых кінаперасувак — 10 тон бензіна. Па распараджэнню намесніка старшыні аблвыканкома Леўчанкі Ф. Ф. у 1940 годзе аблземаддзел выдаў 71-й канторы комунбуда і абласной канторы аўтатранса 3 тоны бензіна і 3 тоны ліграіна.

У радзе машынна-трактарных станцый обласці выяўлены вялікія нястачы і раскраданні гаручага. Толькі ў 11 МТС (Падоўская, Таволжанская, Баклушынская і інш.) нястачы гаручага склалі 107,3 тоны.

У рэзультаце безгаспадарчага скарыстання гаручага, а таксама з прычыны нездавальняючага тэхнічнага стану часткі трактараў, у 149 МТС обласці на 1 снежня 1940 года перарасходвана гаручага супроць планавых норм на 3.913.200 рублёў.

Асабліва марнатраўна расходавалася і разбазарвалася гаручае ў Дубава-Умецкай МТС, Куйбышэўскай обласці. Дырэктар Дубава-Умецкай МТС Самарцаў А. Г. у 1940 годзе прадаў розным арганізацыям і прыватным асобам 20.227 кг гаручага, у тым ліку 10.290 кг бензіна. Гаручае прадавалася райдораддзелу, райспажыўсаюзу, райвыканкому, раённаму аддзелу сувязі і т. д. Апрача таго, Самарцаў выдаў бясплатна 1.000 кг бензіна і 1.483 кг дызельнага паліва шэфу МТС—Куйбышэўскаму карбюратарнаму заводу. На нафтабазе гэтай МТС выяўлена нястача 5.433 кг гаручага. У Дубава-Умецкай МТС, з прычыны бескантрольнага расходавання гаручага і нездавальняючага тэхнічнага стану трактараў, па нішоўных даных утварыўся перарасход супроць планавых норм 88,273 кг. Улік расходавання гаручага ў МТС і трактарных брыгадах запушчан.

Багатаўская МТС незаконна прадала розным арганізацыям і прыватным асобам 4.229 кг гаручага, у тым ліку 2.693 кг бензіна. На нафтабазе выяўлена нястача гаручага ў колькасці 1.078 кг. У МТС дапушчан перарасход гаручага на трактарных работах у памерах 70.612 кг. Дырэктар МТС Буркін В. М. і галоўны бухгалтар Багамолаў П. Л. груба нарушылі пастанову Соўнаркома СССР і ЦК ВКП(б) ад 8 сакавіка 1939 года ў частцы грашовых утрыманняў за перарасход гаручага: кошт перарасходаванага на трактарных работах гаручага ў 1940 годзе на 39.261 руб. незаконна спісан імі ў страты за кошт дзяржавы. Гаручае на нафтабазе Багатаўскай МТС захоўваецца безгаспадарча: з 8 стацыянарных рэзервуараў — 7 няспраўных, з 322 бочак — 142 няспраўныя.

У сувязі з выяўленымі рэвізіяй фактамі Народны Камісар Дзяржкантролю Саюза ССР т. Мехліс адстраніў ад займаемых пасад і прыцягнуў да судовай адказнасці дырэктара Дубава-Умецкай МТС Самарцава А. Г. і кладаўшчыка нафтабазы МТС Салянава І. А. Ад займаемай пасады адстранён намеснік начальніка аблземаддзела Касцянаў П. А. Дырэктару Багатаўскай МТС Буркіну В. М. аб'яўлена вымова. Начальніку аблземаддзела Цыганаву В. С. і галоўнаму бухгалтару Багатаўскай МТС Багамолаву П. Л. аб'яўлена суровая вымова. За процізаконныя распараджэнні намесніку старшыні Куйбышэўскага аблвыканкома Леўчанку Ф. Ф. аб'яўлена вымова, старшыні аблвыканкома Жураўлёву Н. Н. пастаўлена на від.

II.

Адпускаемыя машынна-трактарным станцыям Курскай обласці фонды гаручага і змазачнага матэрыялаў для трактараў і сельгасмашын расходуюцца марнатраўна. Нястачы і раскраданні гаручага на 1 снежня 1940 года толькі па 84 МТС склалі 726,9 тоны. У сувязі з безгаспадарчым скарыстаннем гаручага і нездавальняючай эксплаатацыяй трактараў, МТС обласці на 1 снежня 1940 года перарасходавалі супроць нормы на 3.290.000 руб. гаручага. Начальнік аблземаддзела Горшэлеў А. С., не патрабаваўшы ад МТС актаў на перарасход гаручага па ўборцы палеглых хлябоў, як гэта было прапанавана Наркамземам СССР, склаў неабгрунтаваны разлік на дадатковае фінансіраванне гэтых перарасходаў і такім шляхам незаконна атрымаў ад дзяржавы 1 млн. рублёў.

Разбазарванне гаручага ў Курскай обласці набыло шырокія размеры. У 1940 годзе па 97 МТС незаконна прадана розным арганізацыям і асобам 196,3 тоны гаручага.

Рэвізіяй устаноўлена, што дырэктар Дэмітрыеўскай МТС Сарычаў К. Н. адпусціў на старану 2.001 кг гаручага. Нафтатара і заправачны інвентар у гэтай МТС хаваюцца безгаспадарча. На нафтабазе Дэмітрыеўскай МТС выяўлена нястача 14.661 кг гаручага.

Адпрацаваныя маслы ў МТС не збіраліся. У 1940 годзе сабрана толькі 887 кг, або 2,2 проц. да зрасходаваных масел, замест 40 процантаў, устаноўленых рашэннем Эканамічнага совета № 943 ад 3 верасня 1939 года.

У Амоньскай МТС рэвізіяй таксама ўстаноўлены нарушэнні пастаноў урада аб расходаванні гаручага і змазачных матэрыялаў, адпускаемых для трактарных работ. Дырэктар МТС Зерын І. А., галоўны бухгалтар Літвінаў Н. Н., загадчык нафтабазай Пугачоў К. С. у 1940 годзе незаконна прадалі на старану 1.989 кг гаручага. У сувязі з бескантрольнасцю ў расходаванні гаручага, адсутнасцю тэхнічнага догляду трактараў, у МТС перарасходавана супроць плановых норм 23.540 кг гаручага. На нафтабазе гэтай МТС астаткі гаручага не зніміліся на працяту раду год. Пры рэвізіі нафтабазы МТС выяўлена нястача 26.367 кг. гаручага. У трактарных брыгадах нястача гаручага за 1940 год склала 10.025 кг.

На падставе матэрыялаў рэвізіі Наркам Дзяржкантролю СССР адстраніў ад займаемай пасады і прыцягнуў да судовай адказнасці загадчыка нафтабазай Амоньскай МТС Пугачова К. С. Адстранён ад займаемай пасады дырэктар Амоньскай МТС Зерын І. А. Начальніку курскага аблземаддзела Горшэлеву А. С., начальніку паліўнага аддзела аблзв Тарасаву Д. Н. і дырэктару Дэмітрыеўскай МТС Сарычаву К. Н. аб'яўлена вымова. Накладзены спагнанні і на рад іншых віноўных асоб.

III.

Орджанікідзеўскім краявым земаддзелам груба нарушаліся пастановы ўрада аб расходаванні гаручага і змазачных матэрыялаў. Начальнік крайземаддзела Роніс Е. П. і яго намеснікі Паспелаў А. А. і Гейфман А. І. у 1940 годзе разбазарылі 76,3 тоны гаручага. За кошт лімітаў МТС гаручае выдавалася розным мясцовым арганізацыям, напрыклад, дораддзелу —27.000 кг., краявому аддзелу аховы здароўя — 10.000 кг., крайвыканкому— 1.250 кг., цырку — 150 кг., абутковай фабрыцы—200 кг, крайсовету Асоавіяхіма — 500 кг., краявой пракуратуры — 900 кг і т. п.

Крайземаддзел не кантраляваў расходаванне гаручага ў МТС, у выніку чаго толькі ў 29 МТС Орджанікідзеўскага края за 1940 год разбазарана 79.376 кг гаручага.

У МТС Орджанікідзеўскага края па нішоўных даных дапушчан перарасход гаручага на палявых работах, супроць устаноўленых норм, на 2 млн. рублёў. Начальнік крайземаддзела Роніс Е. П. для таго, каб скрыць перарасход па гаручаму, а таксама незаконна атрымаць сродкі з Дзяржбанка, у снежні 1940 года самавольна павялічыў для 88 МТС края нормы расходу гаручага па ўжо выкананых у 1940 годзе трактарных работах. Такім шляхам перарасход гаручага быў штучна зменшан на 997.000 рублёў.

Рэвізіяй Бешпагірскай МТС устаноўлена, што дырэктар МТС Канстанцінаў Г. І. прадаў розным арганізацыям 322 кг гаручага; апрача таго ім прадана на старану 2.170 кг адпрацаванага аўтола, які належала здаць Нафтазбыту для рэгенерацыі. Улік і хаванне нафтапрадуктаў у трактарных брыгадах Бешпагірскай МТС арганізаван нездавальняюча. У выніку дрэннага захоўвання і бескантрольнага расходвання гаручага за 11 месяцаў 1940 года МТС перарасходавана 77.800 кг гаручага.

У сувязі з выяўленымі рэвізіяй фактамі Нарком Дзяржкантролю Саюза ССР абвясціў строгую вымову начальніку орджанікідзеўскага крайземаддзела Ронісу Е. П. і галоўнаму інжынеру Васільеву В. Н. Пракурору Орджанікідзеўскага края Перваму А. В. за незаконнае атрыманне бензіна з фондаў крайземаддзела аб'яўлена вымова. Прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці рад іншых віноўных асоб.

IV.

Зробленай Наркаматам Дзяржаўнага Кантролю Саюза ССР рэвізіяй дзейснасці раду Галоўных вытворча-тэрытарыяльных упраўленняў і паліўнага аддзела Наркамзема СССР устаноўлена, што Галоўнае ўпраўленне Паўднёвага Ўсхода, Галоўнае ўпраўленне Поўдня, Галоўнае ўпраўленне Паўночнага Каўказа і паліўны аддзел дапусцілі ў МТС, абласных і краявых зямельных аддзелах безгаспадарчае расходаванне і разбазарванне гаручага.

У машынна-трактарных станцыях Галоўнага ўпраўлення Паўднёвага Ўсхода за 11 месяцаў 1940 года перарасходавана гаручага, супроць устаноўленых норм, на 16.461.000 руб., у МТС Галоўнага ўпраўлення Паўночнага Каўказа — на 8.335.000 руб. і ў МТС Галоўнага ўпраўлення Поўдня — на 31.421.000 руб. У выніку дрэннага кантролю ў расходаванні гаручага і незахавання правіл тэхнічнага догляду трактараў у сістэме Наркамзема СССР машынна-трактарнымі станцыямі на 1 снежня 1940 года перарасходавана гаручага на 108.835.000 руб.

Начальнік паліўнага аддзела Наркамзема СССР Сокалаў А. Р., на якога ўскладзен кантроль за правільным расходаваннем гаручага, не змагаўся з масавым разбазарваннем гаручага земельнымі органамі і МТС. Больш таго, Сокалаў сам дазваляў незаконную выдачу гаручага на старану. Паліўная інспекцыя Наркамзема працуе дрэнна і не скарыстана па сапраўднаму для барацьбы з разбазарваннем і безгаспадарчым расходаваннем гаручага.

У сувязі з выяўленымі рэвізіяй фактамі, Нарком Дзяржкантролю адстраніў ад займаемай пасады начальніка паліўнага аддзела Наркамзема СССР Сокалава А. Р., начальніку Галоўнага ўпраўлення Паўднёвага Ўсхода Аляксееву В. С., в. а. начальніка Галоўнага ўпраўлення Паўночнага Каўказа Глатэрману М. А. і начальніку Галоўнага ўпраўлення Поўдня Назарцаву Н. Г. аб'яўлена вымова.

Народнаму Камісару Земляробства СССР тав. Бенедзіктаву І. А. дадзены канкрэтныя ўказанні аб навядзенні парадку ў МТС і спыненні безгаспадарчага расходавання і разбазарвання гаручага.

Наркамат Дзяржкантролю СССР і наркаматы дзяржкантролю саюзных рэспублік прадаўжаюць праверку расходавання гаручага. (ТАСС).

У ПАХОД ЗА ЧЫСТАТУ

12 гадзін дня. У прадзільным цэху мяняюцца змены. Прыёмка і здача змены праходзіць звычайным парадкам. Інжынер Анфілаў, які здае змену, і інжынер Белазечка, які прымае яе, быстра прайшлі ўздоўж прадзільных машын, і праз некалькі мінут у рабочым журнале паявіўся запіс: «Змена прынята ў парадку».

Па ініцыятыве партарганізацыі начальнік цэха т. Астаф'еў праверыў днямі якасць прыёмкі і здачы змены. Да гэтай справы ён прыцягнуў інжынераў і майстраў абодвух змен. Перш за ўсё звярнулі ўвагу на чыстату рабочага месца.

На першым агрэгаце па шкло капсуляцыі былі наклеены ласкуты паперы. Неахайнасць—у паяўнасці. Замест таго каб паперу з-пад вазеліна кідаць у смецевую скрыню, яе наклейваюць на шкло машыны, забрудняючы і без таго пячыстыя шыбы, праз якія трэба наглядаць за правільнасцю ходу машыны. Тут-жа на пячытках валяліся брудныя кавалкі шаўковай рвані.

На памостах агрэгата № 2, заграмаджаючы рабочае месца, валяліся жалезныя трубы, каштоўныя дэталі з каляванага металу і т. д. На лобавай частцы машыны, дзе не павінна быць і парушынкі, выяўлены насадкі, ніцевадзіцелі, гумавыя пружыны.

Ля трэцяга агрэгата сценка была размалявана ўзорамі розпай формы: прадзільшчыкі кідалі абрыўкі мокрых нітак прама на сценку. Ніхто ніколі не звяртаў на гэта ўвагі.

У адной з машын працякала фільера. Прадукцыя гэтай машыны ішла ў чацверты сорт. Апрача гэтага, на чатырох машынах 6 агрэгата было паднята па некалькі бужэй, што з'яўляецца грубым нарушэннем тэхналагічнага рэжыма і зніжае якасць шоўку.

Усё гэта было выяўлена пасля таго, як зменны інжынер і майстры прынялі змену ў «парадку». Майстру тав. Марозу пасля таго ўжо, як было запісана ў журнале, што «змена здана ў парадку», прышлося многа папрацаваць ля прадзільных машын.

У дакладзе на XVIII партыйнай канферэнцыі таварыш Маленкоў указаў, што там, дзе бруд і бескультур'е, там нарушаецца тэхналагічная дысцыпліна, там немінучы брак. Так атрымалася і ў нас на фабрыцы.

Зараз у цэхах разгарнуўся паход за культуру ў рабоце, за чыстату станкоў і рабочага месца. Прадзільшчыкі з'явіліся ініцыятарамі гэтай справы. Партарганізацыя падтрымала іх ініцыятыву. Вялікую работу па прывядзенню ў культурны выгляд машын і цэхаў праводзяць комсамольцы.

А. В. ШЧАРБАКОЎ,
сакратар партыйнага бюро магілеўскай шоўкавай фабрыкі імені Куйбышэва.

Вайна і калоніі

Вайна выклікала найзялікшыя патрасенні ў эканоміцы капіталістычнага свету. Яна разбурыла сусветныя рынкі збыту, яна разарвала міжнародныя гандлёвыя сувязі.

Дэзарганізацыя сусветнага гандлю з асаблівай сілай адбілася на калоніях. Экспарцёры каланіяльнай сыравіны і прадуктаў разлічвалі, што вайна адкрые перад імі шырокі шлях да нажывы. Біржавыя акулы, звязаныя з каланіяльным гандлем, падлічвалі чакаемыя барышы. Але іх разлікі на «благодзеянні вайны» не апраўдаліся. Вароты ў міфічную краіну капіталістычнага «працвітання» насцеж не расчыніліся, аграрны крызіс у калоніях не паслабляўся, залежы экспартных тавараў прадаўжалі расці, а цэны пасля кароткага, непрацяжнага скачка ўверх стабілізаваліся і ўжо амаль год стаяць на адным узроўні.

Гэта адбылося таму, што ў ходзе вайны ў Еўропе рынак збыту каланіяльнай прадукцыі рэзка скараціўся. К таму-ж Англія страціла магчымасць арганізаваць збыт тавараў, якія яна закупіла і закантрактавала ў сваіх калоніях і дамініёнах.

Заходняя Еўропа амаль цалкам выпала з сістэмы сусветнага гандлю. Непераможныя бар'еры выраслі на шляху каланіяльных тавараў у Германію, Італію, скандынаўскія краіны. Францыя, Бельгія, Галандыя аказаліся адрэзанымі ад калоній. Па-за межамі дасягальнасці каланіяльных тавараў апынуўся і паўднёвы ўсход Еўропы. У рэзультаце велізарная частка экспартнай прадукцыі калоній асталася без старых рынкаў збыту. Горы тавараў растуць у портах. Растуць піраміды бавоўны, шпаніцы, цукру—як помнікі заняпаду і разарэння заняволеных і прыгнечаных капіталізмам каланіяльных краін.

Францыя, рассечаная мечам вайны на дзве часткі, страціла ўсе гандлёвыя сувязі са сваёй каланіяльнай імперыяй, ахапляючай велізарную тэрыторыю ў 12,5 млн. кв. км. Французскія калоніі былі прыкаваны да сваёй метраполіі нелічонымі ланцугамі эканамічнага рабства. Уся іх гаспадарка была прыстасавана да патрэб французскага рынка, да задавальнення яго заказаў і яго капрызаў. Вываз з гэтых калоній кукурузы, цукру, земляного арэха, кофе, капры, банапаў прызначаўся амаль цалкам толькі «цудоўнай Марыяне» (Францыя). На Францыю прыпадала каля 90 проц. вывазу з яе калоній шпаніцы, аўса, ячменю, жыта. Метраполія пагынала амаль 80 проц. усяго экспарта Французскай Заходняй Афрыкі і каля 65 проц. экспарта Французскай Экватарыяльнай Афрыкі. Гэтым калоніям—гарадам і фермам метраполіі — це так ужо лёгка перабудаваць сваю эканоміку, і так скалечаную зверскай эксплаатацыяй.

Бельгійскае Конга, задуманае яшчэ Леапольдам II—гэтым каранаваным плантатарам — у якасці аграрнага прыдатка прамысловай Бельгіі, пакіроўвала ў Бельгію 77,5 проц. усяго экспарта. Медзь, волава, кофе, какао, земляны арэх, пальмавае масла—усе гэтыя тавары шырокім патокам уліваліся ў антверпенскі порт.

Амаль увесь еўрапейскі рынак згубілі і брытанскія калоніі. Апрача таго, яны апынуліся яшчэ ў цяжкіх пісках забарон або абмежаванняў, накладзеных на іх гандаль. З першых-жа дзён вайны ўся Брытанская імперыя была спіснута сістэмай ліцэнзій, якая забараняла ўвоз і вываз шырокай наменклатуры тавараў без спецыяльных дазволаў. Гэта сістэма і дазволіла Англіі закупіць у калоніях і дамініёнах вялізную масу тавараў, пачынаючы ад аўстралійскай воўны і канчаючы бабамі какао на Залатым Беразе (Афрыка). Англія не толькі закупіла наяўныя тавары, але і закантрактавала зборы і ўраджай на ўвесь час вайны і нават яшчэ на адзін год пасля яе заканчэння.

Англія сканцэнтравала ў сваіх руках такія абшырныя таварныя масы зусім не з мэтай забяспечыць унутранае спажыванне метраполіі. Іншыя планы стаялі перад англійскім міністэрствам снабжэння. Шырокія камерцыйныя аперацыі, праведзеныя ў першыя-ж дні вайны, павінны былі даць Англіі амаль бязмежны валютны фонд, палярэдзіць магчымае павышэнне цэн, затрудніць яе прадпрыемствам закупку сыравіны. У аснове гэтых аперацый ляжала і імкненне патапіць сабекошт вайны.

Спатрэбілася, аднак, не многа часу, каб гэтыя разлікі былі ў значнай ступені зламаны. Пасля таго, як саюзныя з Англіяй і нейтральныя краіны Заходняй Еўропы аказаліся выкраслены з спіска пакупнікоў манапалізаваных Лонданам тавараў, а ў самой Англіі было ўстаноўлена абмежаванне спажывання, рэалізацыя гэтых камерцыйных здзелак сустрэла сур'ёзныя затрудненні.

Чарга пакупнікоў не выстрайвалася ля складаў закупленых Англіяй тавараў. Наадварот, пакупнікоў гэтых было ўсё менш. За выключэннем асобных відаў стратэгічнай сыравіны, і раней знаходзіўшых галоўны збыт на амерыканскім рынку, усе закупленыя Англіяй тавары аселі ў калоніях.

К таму-ж сусветныя запасы асобных відаў сыравіны і прадуктаў харчу прадаўжалі няўхільна расці, давілі сваім цяжарам на рынак, збівалі цэны. Па падліках міністэрства земляробства ЗША, да сусветных запасаў далучаюцца цяпер перапоўнены на 1941 год астаткі ў 1.400 млн. бушэлей пшаніцы і 20 млн. кіп бавоўны (бушэль — 27 кг, кіпа — 217,7 кг). На сусветны рынак паранейшаму давяць каласальныя запасы кофе, не гледзячы на тое, што за апошнія восем год у Бразіліі было знішчана кофе ў колькасці, роўнай трохгадоваму сусветнаму спажыванню.

Выхады з рынкаў Афрыкі, Індыі, Інданезіі закупораны, што прывяло да стварэння велізарных залежаў тавараў, прызначаных на пнённе або штучнае знішчэнне, да падзення цэн і абвастрэння ў калоніях аграрнага крызіса.

Надзеі Англіі на стварэнне шырокага валютнага фонда падарваны Злучанымі Штатамі Амерыкі. ЗША—асноўны пакупнік брытанскага каўчука і волава—яшчэ перад вайной патрабавалі ад Англіі ўстанаўлення абмену каўчука і волава на амерыканскую бавоўну. Лонданскаму камітэту, рэгуліруючаму вытворчасць і экспарт каўчука, прышлося здацца. Яшчэ да пачатку вайны ўступіла ў сілу пагадненне аб абмене вялікай партыі амерыканскай бавоўны на каўчук з брытанскіх калоній. Зацікаўленая ў прыцягненні ЗША на сваю старану, Англія пайшла на гэту здзелку. У абмен на каўчук, прынасіўшы ёй верныя амерыканскія долары, яна вымушана была прынясці бавоўну, якой і без таго была забяспечана ў поўнай меры.

Затым ЗША патрабавалі адмены забароны, накладзенай на вываз каўчукавых чаранкоў, і дабіліся ад Лонданскага камітэта абавязацельства знізіць у 1941 г. цэны на каўчук на 10 проц.

Дэзарганізацыя міжнароднага гандлю прывяла да вялікага скарачэння ўвозу ў калоніі прамысловых вырабаў і прадметаў шырокага спажывання. Французскія тавары займалі 44 проц. у імпарце Французскай Заходняй Афрыкі і 35 проц. — у імпарце Французскай Экватарыяльнай Афрыкі. Значнае месца ў імпарце каланіяльных краін займала і Германія. Францыя, Бельгія, Германія пастаўлялі калоніям машыны, абсталяванне, вугаль, бавоўняныя тканіны. Цяпер з еўрапейскіх дзяржаў толькі адна Англія ў сілах падтрымліваць гандлёвыя зносіны з каланіяльнымі краінамі. Але гандлёвыя сувязі Англіі па марскіх шляхах усё больш абмяжоўваюцца.

Насельніцтву некаторых калоній, напрыклад Брытанскай Малайі, прыходзіцца цярпець ад нястачы і харчовых тавараў. Гучыць як быццам парадаксальна: калонія, якая ўладае абшырным зямельным фондам, бязмежным багаццем пладародных зямель, не можа пракарміць сябе! Але такая «парадаксальнасць» гаспадарання капіталістаў. Нястрыманая пагоня англійскіх гумавых каралёў за нажывай ператварыла Брытанскую Малайю ў каўчукавую плантацыю, адсунула на задні план вытворчасць рыса і пакінула нават Сінгапур без салідная харчовай базы.

Цяжар вайны наваліўся на працоўныя масы калоній не толькі падзеннем цэн на прадукцыю іх працы, не толькі дарагавізнай прадуктаў шырокага спажывання: вайна патрабавала ад іх новых чалавечых афяр, прынесла новыя паборы, новыя падаткі, новыя формы прымусовай працы. За кошт насельніцтва калоній праводзіцца фартыфікацыйныя работы, утрымліваюцца туземныя «дабравольчыя» атрады. Бяспраўнаму, прыгнечанаму насельніцтву прыходзіцца адказваць за ўсё: і за ваенныя падаткі, і за экспартныя падаткі, і за дарагавізну фрахтаў, і за кабальныя кантрактацыйныя здзелкі.

Такая цана, якою прыходзіцца расплачвацца калоніям за еўрапейскую вайну. Вайна руйнуе каланіяльную сельскую гаспадарку. Працоўным масам яна прынесла эксплаатацыю, якая робіцца ўсё больш моцнай, рэзкае пагоршанне жыццёвага ўзроўню, незлічоныя беды.

Гэта ўзмацніла супярэчнасці паміж працай і капіталам.

Ужо праз поўгода пасля пачатку вайны ў Індыі высока ўзнялася хваля забастовак. Толькі за тры месяцы мінулага года (красавік, май і чэрвень) у гэтай калоніі адбылося 100 забастовак, у якіх прыняло ўдзел каля 275.000 рабочых. Восенню мінулага года вялікія стачкі ўспыхнулі ў горнай і тэкстыльнай прамысловасці. У снежні 1940 года забаставалі 17.000 рабочых Напцура. Адначасова ў тым-жа раёне ўспыхнула стачка і дзесяці тысяч рабочых вугальнай прамысловасці, патрабаваўшых спынення бесканечных вылітаў з заработнай платы.

Ужо з трэцяга месяца вайны пачаліся забастоўкі ў Брытанскай Малайі. Шахцёры рудніковай волава ў Селангоры, рабочыя лесапільных заводаў у Сінгапуры, вугляпоны ў Бату Аранге, матросы ў пенангскім парту патрабавалі павышэння заработнай платы, устанаўлення 9-гадзіннага рабочага дня і нядзельнага адпачынку.

Буйныя падзеі разыграліся ў мінулым годзе ў Паўночнай Радэзіі. Забастаўшыя на медных рудніках рабочыя (у іх ліку і 15.000 неграў) звярнуліся да адміністрацыі з патрабаваннямі 8-гадзіннай рабочай змены і палепшання жыллёвых умоў. У адказ на гэтыя патрабаванні мясцовыя ўлады пацягнулі да рабочых пасёлкаў паліцэйскія атрады. У адным з пасёлкаў адбылася сутычка паміж бязбройнымі шахцёрамі

Дадзім краіне больш цэглы!

★ ★ ★

Дзяржаўным планам на 1941 год прадугледжана пабудаваць па СССР 2.955 новых фабрык, заводаў, электрастанцый і значна расшырыць існуючыя прамысловыя прадпрыемствы.

У выкананні грандыёзнай праграмы будаўніцтва вяліка роля работнікаў сістэмы Наркамата прамысловасці будаўнічых матэрыялаў, у тым ліку работнікаў цагельных прадпрыемстваў.

Ніжэй мы публікуем артыкулы работнікаў перадавога ў Беларусі мінскага цагельнага завода № 1, які, рыхтуючыся да дастойнай сустрэчы XVIII партыйнай канферэнцыі, выканаў 15 лютага двухмесячную праграму першага квартала і даў краіне 3.282.000 штук цэглы. 10 сакавіка завод выконвае праграму першага квартала.

За ўзорную работу калектыў завода атрымаў чырвоны пераходны сцяг Наркамата прамысловасці будматэрыялаў БССР і ЦК саюза.

Рабочыя і інжынерна-тэхнічныя работнікі цагельнага завода № 1 з'явіліся ініцыятарамі ўсебеларускага спаборніцтва цагельных прадпрыемстваў БССР і абавязаліся даць звыш плана ў першым квартале гэтага года 1.300.000 цаглін.

Натхнёны рашэннямі XVIII партыйнай канферэнцыі, калектыў завода змагаецца за строгую дысцыпліну, за чоткае планіраванне, увядзенне строгага тэхналагічнага рэжыма і ўзорную падрыхтоўку да сезона.

Задача калектыва — не ўпускаць пярэшынства, моцна трымаць у руках чырвоны пераходны сцяг, арганізаваць чоткую работу ўсіх звенняў, каб даць краіне больш цэглы.

★ ★ ★

ЯК МЫ АСВОІЛІ ПРАЕКТНУЮ МАГУТНАСЦЬ СУШЫЛАК

На першы цагельны завод я прыйшоў працаваць яшчэ ў 1924 годзе. З гэтага часу яшчэ маё цесна пераплятаецца з дзейнасцю і ростам завода. У той час завод прадстаўляў сабой мізэрнае прадпрыемства з некалькімі дзесяткамі рабочых.

Завод вырас і ўмацаваўся ў апошнія годы. Цяпер — гэта буйнейшае ў рэспубліцы прадпрыемства па вырабу цэглы. Вытворчая магутнасць яго вылічаецца ў 30 мільёнаў цаглін у год.

Я доўгі час працаваў выгрузчыкам гофманскіх пячэй абпалу. У 1936 годзе, на 54 годзе майго жыцця, стаў істапнікам сушылак цэглы-сырца. Гэта работа даволі адказная і патрабуе адпаведнай спецыялізацыі.

Працэс сушкі цэглы-сырца прадаўжаецца трое сутак. Увесь гэты час у сушылках трэба падтрымліваць тэмпературу ў 200° па Цэльсію. Гэта дасягаецца шляхам пропуску праз сушылку гаручых газаў, якія паступаюць са спецыяльнай топкі. У топцы спальваецца торф. Усё майстэрства істапніка заключаецца ва ўменні рэгуліраваць тэмпературу, трымаць яе ўвесь час на аднолькавым узроўні.

За апошнія годы я дабіўся ў гэтым немалых поспехаў. Пры малейшым адхіленні тэмпературы ад нормы неадкладна прымаю меры. Пры празмернай тэмпературы на некаторы час змяншаю падачу паліва, крыху прыкрываю шыберы, г. зн. рэгулятары падачы гаручых газаў у сушыльныя камеры; пры паніжэнні тэмпературы дабаўляю патрэбную колькасць паліва, адпаведным чынам утанаўляю шыберы. Паліва заўсёды ў мяне пад рукамі і ў патрэбнай колькасці.

Так-жа тэхнічна правільна працуюць зменныя брыгады істапнікоў тт. Бродскага і Налецкага. Зладжаная работа нашых трох брыгад забяспечвае поспех, павышае якасць сушкі.

Аб тым, як мы дабіліся асваення праектнай магутнасці сушылак, трэба расказаць больш падрабязна. У гэтым безумоўна вялікая заслуга нашага галоўнага інжынера т. Лаўца. Па яго разліках у сушыльных камерах былі ўстаноўлены новыя рэгулятары падачы гаручых газаў, новыя дзверы, якія даюць магчымасць поўнасцю пазбегнуць страт цеплыні і, самае галоўнае, — мы ўвялі новую сістэму кладкі цэглы.

Звычайна ў сушылках цэглу ўстанаўляюць на кант на асобных рамках, пры аднолькавай адлегласці паміж асобнымі цаглінамі як унізе, так і ўверсе сушылкі. Мы прышлі да высновы, што пры такой кладцы звыш нормы расцягваецца перыяд сушкі, цэгла высыхае нераўнамерна, ад чаго бывае значная колькасць браку. Мы пачалі ўстанаўляць цэглу з павялічанымі зазорамі паміж цаглінамі ўнізе і з заменшанымі ўверсе сушылкі. Гэта, як і трэба было чакаць, дало раўнамерную сушку цэглы ад нізу да верху.

Апрача таго, мы дабіліся поўнага скарыстання сушыльнай плошчы, рэгулярнай падачы паліва, давялі да прадзела (200°) тэмпературу ў сушылках. Гэта ўсё разам узятае дало магчымасць поўнасцю скарыстаць праектную магутнасць сушылак — 43 тысячы цаглін у суткі.

Гэтых поспехаў мы дабіліся яшчэ ў IV квартале 1940 года. У пачатку гэтага года на нашым заводзе, як і па ўсёй краіне, пракацілася магутная хваля сацыялістычнага спаборніцтва імені XVIII Усесаюзнай партканферэнцыі. У спаборніцтва ўключыўся і наш сушыльны цэх. Мы ўзялі абавязацельствы давесці штодзённую прадукцыйнасць сушылак да 45 тысяч цаглін, павысіць якасць сушкі. Абавязацельства перавыкананы. У дні работы канферэнцыі мы давялі выпрацоўку да 48—50 тысяч цаглін. Зараз прымаем меры, каб рэкордную выпрацоўку даваць і ў далейшым.

В. БЛАЖЭВІЧ,
істапнік сушылак участка № 2.

ЧЫРВОНЫ СЦЯГ НЕ АДДАДЗІМ

Фармовачны цэх участка № 3 за высокай адукцыйную работу ў чацвертым квартале 1940 года атрымаў пераходны чырвоны сцяг завода. Усё-ж мы часам не маглі поўнасцю забяспечыць узросшыя патрэбнасці сушыльнага цэха. Трэба было дабіцца далейшага павышэння прадукцыйнасці фармовачных машын.

Вестка аб скліканні XVIII партыйнай канферэнцыі паслужыла магутным штуршком для далейшага разгортвання сацыялістычнага спаборніцтва за высокую прадукцыйнасць працы.

У рэзультаце спаборніцтва сярэдняя выпрацоўка рабочых павысілася да 122 проц. нормы. А лепшыя стаханаўцы (кругаўшчыкі тт. Агеева і Жаркоўскі, адвозчыкі сырца ад праса тт. Варажкоў, Пучынскі і Краснашчокава) давалі ад 170 да 210 проц. нормы. У цэху не было ні аднаго рабочага, які не выконваў-бы норму.

Агульны творчы ўзлым забяспечыў нам выдатныя перамогі. Да дня адкрыцця партыйнай канферэнцыі мы выканалі двухмесячнае заданне на 100,3 проц. Да канца лютага далі звыш праграмы 430 тысяч штук цэглы, дабіліся значнага гаспадарчага эканоміі расхода паліва.

Зараз мы прымаем усе меры для далейшага павышэння прадукцыйнасці працы з тым, каб да 10 сакавіка поўнасцю выканаць квартальнае заданне. Усю сваю работу будуем у свеце рашэнняў XVIII партканферэнцыі. У фармовачным і машынным цэхах наводзім большэвіцкі парадак і чыстату. Распрацавалі штодзённы графік для кожнай брыгады, па машынному цэху склалі праект планава-папераджальнага рамонту. Гэта дасць магчымасць планамерна, з дня ў дзень даваць высокую выпрацоўку.

Зараз перад намі стаіць не менш важная задача—узорна падрыхтавацца да летняга сезона. З гэтай задачай мы справімся паспяхова толькі пры ўмове, калі нас своечасова забяспечаць лесаматэрыялам. Пакуль што матэрыялаў нехапае, і гэта можа з'явіцца тормазам у падрыхтоўцы да сезона.

Наш цэх—суцэльна стаханаўскі. Рабочыя і работніцы гараць жаданнем працаваць яшчэ лепш. Пры дапамозе з боку дырэкцыі завода мы даб'емся яшчэ большых поспехаў. Пераходны чырвоны сцяг і ў далейшым будзе горда развявацца ў нашым цэху.

С. В. АЛІСЕВІЧ,
начальнік фармовачнага цэха ўчастка № 3.

★

ЗДАБЫЧА ГЛІНЫ Ў ЗІМОВЫХ УМОВАХ

Некалькі год назад наш цагельны завод перайшоў на бесперапынную круглагадовую работу. Да 1941 г. гліну ў зімовых умовах здабывалі ручным спосабам. На гэтай рабоце былі заняты дзесяткі і сотні рабочых. Усё-ж часта гліна паступала нераўнамерна. Гэта выклікала перабоі ў рабоце фармовачнага, сушыльнага і пячнога цэхаў.

У пачатку 1941 года ўпершыню ў Беларусі мы прымянілі для здабычы гліны ў зімовых умовах экскаватар. Гэта магутная машына аграўдала нашы надзеі. Яна бесперабойна давала патрэбную колькасць гліны нават пры 25-градусных марозах.

Каб забяспечыць бесперабойную работу экскаватара, мы прымянілі ўвесь лепшы вопыт экскаватарыстаў. Каўшы і ланцуг заўсёды змазвалі растворам паварагай солі ў карасіне. Месца здабычы гліны ў час перапынкаў у рабоце засыпалі тоўстым слоем снегу. Гэта зберагала яго ад прамярзання, аблягчала работы ў наступны дзень.

У сацыялістычным спаборніцтве імені XVIII партканферэнцыі наш цэх заняў адно з першых месц на заводзе. Мы забяспечылі небывалую па прадукцыйнасці работу фармовачнага, сушыльнага і пячнога цэхаў. Працуючы з двайной і нават трайной нагрузкай супроць нормы, мы дапамаглі заводу выканаць двухмесячную праграму да дня адкрыцця партканферэнцыі.

За ўвесь час у нас не было ні аднаго выпадку аварый або прастояў. Машыніст экскаватара т. Сапега — сапраўдны майстар сваёй справы. Экскаватар пад яго кіраваннем паспяхова выконвае цяжкую працу сотняў рабочых рук.

Зараз у разгары сацыялістычнае спаборніцтва на датэрміновае выкананне квартальнага плана да 10 сакавіка. Мы з чэсцю выканаем наша абавязацельства — бесперабойна даваць апрацоўчым цэхам патрэбную колькасць сыравіны. Залогам гэтаму — наш двухмесячны вопыт работы ў зімовых умовах.

А. Н. АЛЯКСЕЕЎ,
начальнік цэха сыравіны.

Выгружаць цэглу трэба ўмець

Рабочыя нашага цэха яшчэ ў пачатку года аднадушна ўключыліся ў сацыялістычнае спаборніцтва імені XVIII партканферэнцыі. Спаборнічалі пагрузчыкі і выгрузчыкі гофманскіх пячэй, абпальшчыкі і падвозчыкі цэглы. Усюды біла ключом жыццеіраласная творчая праца.

Уключыўшыся ў сацыялістычнае спаборніцтва, я ўзяў абавязацельства штодзённа даваць не менш двух норм. І, трэба прызнацца, я далёка пакінуў за сабою таварышаў. Як наліяраддні, так і ў дні работы канферэнцыі я штодзённа выгружаў па 9—10 тысяч штук цэглы — да 247 проц. нормы. Сярэдняя выпрацоўка за IV квартал 1940 года і два месяцы гэтага года дасягнула 207 процантаў задання.

Чым-жа я дабіваюся поспехаў? Перш за ўсё, безумоўна, поўным скарыстаннем усіх 480 мінут рабочага часу. Ні адна мінута ў мяне не прападае даремна. На тачку я заўсёды кладу 150 цаглін пры норме 130. На адну аперацыю — нагрузку тачкі, вывад яе на плашчадку і складку цэглы ў клетку — затрачваю не больш 6—7 мінут. Майму прыкладу следуюць усе выгрузчыкі брыгады. Выпрацоўка іх ніколі не бывае ніжэй 150 процантаў нормы.

Каб так працаваць, патрабуецца свайго роду спецыялізацыя і вынослівасць. Я смела абавязваюся штодзённа выгружаць не менш 10 тыс. штук цэглы пры норме ў 4.100 штук. Так будуць працаваць усе рабочыя маёй брыгады. Я дапамагу ім сваімі парадамі, падзялюся вопытам.

Адпаведна з выпрацоўкай расла і мая зарплата. Калі раней я зарабляў 400—500 рублёў у месяц, то зараз зарабляю ў сярэднім 1.000 рублёў. Мая праца высока ацэньваецца. Гэта натхняе мяне на новыя, яшчэ большыя вытворчыя перамогі.

Н. А. ШАХ,
выгрузчык чацвертага цэха абпалу.

Стаханаўская змена майстра Р. Якубоўскага цагельнага завода № 1 ля прэсавальнай машыны. Злева направа: Н. Пятрова, Г. Буранкова, Н. Дарашэвіч, Н. Карпенка і майстар Р. Якубоўскі. Фото Б. Дынкіна.

АРГАНІЗАВАНА СУСТРЭЦЬ ВЕСНАВУЮ СЯЎБУ

РЭЗУЛЬТАТЫ АБУРАЮЧАЙ БЕСТУРБОТНАСЦІ

Набліжаецца час выхаду трактарнага парка на калгасныя палі. Чацвертая вясна трэцяй Сталінскай пяцігодкі прынясе новыя перамогі сацыялістычнага земляробства нашай рэспублікі.

У гэтым годзе значна лепш чым у мінулым арганізаван асенне-зімовы рамонт трактараў.

Аднак не ўсюды яшчэ сур'ёзна аднеслісь да падрыхтоўкі трактарнага парка. Праверкай Наркаматам дзяржаўнага кантролю якасці рамонту трактараў устаноўлена, што асобныя кіраўнікі аблземаддзелаў, задаволіўшыся цыфрамі зводак, прагледзелі якасць рамонту ў некаторых МТС. У Гомельскай вобласці з праверапых 286 трактараў 108 аказаліся непрыгоднымі да эксплаатацыі.

У Брагінскай МТС з 10 праверапых трактараў з прычыны нізкай якасці рамонту не аказалася ні аднаго прыгоднага да эксплаатацыі. У Копыльскай МТС забракаваны ўсе 12 адрамантаваных трактараў; у большасці з іх выяўлена па 57 дэфектаў. У Шацкай МТС з 25 адрамантаваных у 8 выяўлена адсутнасць электраабсталявання і трубак вадзянога карбюратара. На ўсіх трактарах пастаўлены шатунныя падшыпнікі старой канструкцыі.

У Замастоцкай МТС пры праверцы якасці рамонту выяўлена, што з 14 адрамантаваных трактараў толькі адзін прыгодзен да работы, астатнія адрамантаваны з парушэннем тэхнічных норм.

Ва ўсіх 12 праверапых трактарах Прыямінскай МТС ёсць вельмі сур'ёзныя дэфекты. У радзе трактараў выяўлены перакос поршняў у цыліндрах, не прыцёрты клапаны, дрэнна прыпаяны ўкладышы шатунных падшыпнікаў.

Нядобраякасна адрамантаваны трактары і ў Добрушскай МТС. З 32 машын толькі 9 аказаліся прыгоднымі для эксплаатацыі.

У Гомельскай МТС камісія з удзелам дырэктара МТС тав. Вішнеўскага і старшага механіка тав. Олінцэвіча прызнала, што трактары пасля рамонту годны да эксплаатацыі. Праверкай устаноўлена, што ў 26 (з 31) праверапых трактараў ёсць вялікія дэфекты. Выпадкі нядобраякаснага рамонту трактараў выяўлены таксама ў іншых машынна-трактарных станцыях.

Усё гэта гаворыць аб тым, што Наркамзем і абласныя зямельныя аддзелы не ўдзялілі належнай увагі якасці рамонту. Некаторыя партыйныя і совецкія арганізацыі перадаверылі гэты важнейшы ўчастак дырэктарам МТС.

Асобныя работнікі Наркамзема і абласа праявілі бестурботнасць і прымірэнцтва да браку і бракаробаў. Так, інжынер Наркамзема т. Ціхановіч у Кіраўскай МТС падпісаў акт прыёмкі 33 трактараў, у якіх потым былі выяўлены вялікія недаробкі.

Начальнік вытворча-тэрытарыяльнага ўпраўлення Мінскага абласа тав. Галаўня прызнаў добра адрамантаванымі трактары Ляздзінскай МТС, у якіх патрабавалася замена пальцаў гусеніц, даўкамплектаванне маслёнкамі «Зерка», была нясправўна папярэчная цяга і інш.

Інжынер Гомельскага абласа т. Ласенка прыняў у Жлобінскай МТС трактары з вялікімі дэфектамі і не прыняў мер, каб іх знішчыць.

Нядобраякасна адрамантавалі машыны і ў радзе соўгасаў. У соўгасе «Уваравічы» выпушчаныя з рамонту два трактары маюць па 12 дэфектаў. У соўгасе «Чырвоная звязда» ў трактары СТЗ выяўлены 23 дэфекты. Такое-ж становішча ў соўгасах «Пісарэўшчына», «Астрагляды» і іншых.

У радзе МТС і соўгасаў дрэнна арганізаван рамонт сельскагаспадарчых машын і прычэпнага інвентара. У асобных МТС не ўвесь прычэпны інвентар спягнут на сядзібу. Так, у Прыямінскай МТС з 42 плугоў на сядзібе ёсць толькі 11. Дзе знаходзяцца астатнія — кіраўнікі МТС нават не ведаюць.

Выключна дрэнна ідзе загатоўка драўнянага паліва для газагенератарных трактараў. На 1 сакавіка Жлобінская МТС выкупіла 450 кубаметраў драўнянага паліва, вывезла-ж толькі 30 кубаметраў; Сялецкая МТС — з 500 кубаметраў вывезла 11; Чачэрская МТС — з 900 кубаметраў — 230.

Работнікі Наркамзема БССР і абласных зямельных аддзелаў, кіраўнікі МТС павінны неадкладна выправіць дэфекты, дапушчаныя ў адрамантаваных трактарах. Неабходна таксама хутчэй закончыць рамонт трактараў і інвентара, добраякасна выканаць усе работы.

Н. ТКАЧОЎ,
інструктар сельгасаддзела ЦК КП(б)Б.

КАЛГАС ПЕРАД ВЯСНОЙ

Узгоркі супясчанай зямлі з каменнямі і ядлоўцам на ўзмежках — такімі былі надзелы сялян вёскі Капцёўка. Наўкола іх прасціраліся нівы, мурожныя сенажаці, пасбішчы і стройныя, гонкія лясы памешчыка Еўрэінава.

Сяляне вымушаны былі ганяць жывёлу на так званую пашу за паўтара кілометра. Пазней барон Еўрэінаў адняў у сялян і гэту пашу — ён забараніў прагон жывёлы. Як ні стараліся сяляне даказаць, што гэта дарога павінна належаць ім, нічога не дапамагло.

У судзе адпойчы з насмешкай «гарэкамендавалі» капцёўцам перавозіць жывёлу па пасбішча на самалётах. З года ў год павінны былі сяляне адпрацоўваць памешчыку за прагон жывёлы па сваёй-жа дарозе.

Па-іншаму зажылі капцёўцы зараз, пры совецкай уладзе. Хутка будзе год, як у нас арганізавалася сельскагаспадарчая арцель «Першае мая», членамі якой з'яўляюцца 20 сем'яў былых батракоў і беднякоў. Радасна будуюць яны сваё новае вольнае жыццё.

У мінулым годзе наш калгас дабіўся нядрэнных ураджаяў. Гэта забяспечыла поўнацэнны, багаты працадзень: тры кілограмы зернавых, 16 кілограмаў бульбы, 4 кілограмы буракоў, 1 рубель 20 капеек грашыма.

Сёлета мы паставілі перад сабой задачу: дабіцца не менш 14—16 цэнтнераў зернавых і 200 цэнтнераў бульбы з кожнага гектара.

Мы запланіравалі засеяць 37 гектараў аўса, 14—ячменю, 20—бульбы, 5,5 гектара ільнаніцы, падсеяць канюшыну на плошчы 20 гектараў. Апрача гэтага, калгас засее 8 гектараў гародніны. Каб атрымаць раннюю гародніну, мы закладваем 50 парніковых рам. Вясной пасадзім 5 гектараў саду і клубніку.

Зараз у калгасе ўсё падпарадкавана падрыхтоўцы да сяўбы. Закончана ачыстка і сартыроўка насення і праверка яго ў кантрольна-насенняй лабараторыі.

Закончан таксама рамонт сельскагаспадарчага інвентара. Каваль Лявон Грыко добра адрамантаваў 10 плугоў, 6 пружынавых боран, 3 культыватары і 16 боран.

Асаблівую ўвагу мы звяртаем на падрыхтоўку каня і збруі. Слабейшым коням пачалі даваць узмоцненую норму кармоў.

Мы прыкладзем усе сілы к таму, каб узорна і своечасова правесці веснавую сяўбу і заваяваць высокі ўраджай. Гэта жаданне ўсіх членаў нашай арцелі.

П. Н. ДЗЯНІШЧЫК,
старшыня калгаса «Першае мая», Капцёўскага сельсовета, Гродненскага раёна.

Вясна ідзе

БЕЛАСТОК. (Кар. «Звязды»). Палі ўжо аслабаніліся ад зімняга пакрову, толькі ў лясах і глыбокіх лашчынах яшчэ ляжыць снег, але і там яго застае вясна.

Устанавілася цёплае надвор'е. 4 і 5 сакавіка тэмпература паветра дасягала 7 градусаў цяпла, нават з вышыні 1000 метраў радыёзонд, выпушчаны беластоцкай метэаралагічнай станцыяй, прасігналізаваў тэмпературу ў 6,6 градуса цяпла.

У горадзе некаторыя садоўнікі падрыхтавалі ўжо градкі і клумбы, хутка яны высадзяць тут фасаду розных кветак.

Сяляне зараз выконваюць апошнія перадпасеўныя работы. Ва ўсіх калгасах вобласці праходзіць агляд гатоўнасці да сяўбы. У аглядах, апрача актыва калгаса, прымаюць удзел працаўнікі райкомаў партыі і старшыні сельсветаў.

Днямі таксі агляд адбыўся ў калгасе імені Дзержынскага, Ломжынскага раёна. Камісія дала станоўчую ацэнку падрыхтаванасці калгаса да сяўбы. Дзержынцы з ліпкам забяспечаны насеннем высокай каэльнасці; сельгасінвентар поўнасцю адрамантаван і знаходзіцца пад навесцю. Рабочая жывёла — вышэй сярэдняй укормленасці. На час сяўбы калгас забраніраваў дастатковую колькасць сена, 96 цэнтнераў канцэнтраваных і 453 цэнтнеры сакавітых кармоў. Ужо вывезена на поле 780 тон гною. За брыгадамі і звеннямі замацаваны ўчасткі зямлі.

Калгас імені Сталіна, Саколкаўскага раёна, значна горш падрыхтаваўся да сяўбы. Там яшчэ не ачышчана насенне, не вывозіцца на поле гной, не арганізаван збор мясцовага ўтнаення, коні знясіленыя, хоць кармоў у калгасе дастаткова.

Некаторыя калгасы разлічваюць у канцы сакавіка распачаць на высокіх участках палявыя работы. У гэту вясну на палях вобласці будзе працаваць 230 калёсных і гусенічных трактараў. Трактарны парк вобласці на працяту лета папоўніцца яшчэ 41 машынай. Трактары будуць апрацоўваць палі калгасаў і бясконных сялян-адназасобнікаў. Гледзячы на армаду стальных коней, якія рыхтуюцца выйсці ў поле, сяляне з усмешкай успамінаюць, што ва ўсім беластоцкім ваяводстве да прыходу совецкай улады толькі 7 буйных памешчыкаў мелі па аднаму маламагутнаму трактару тыпу «Фордзон», на якіх тады глядзелі, як на цуда. Цяпер рокат магутных совецкіх машын чуваць ў кожнай вёсцы.

Е. УЗДЗЕНСКІ.

НОВЫ КАЛГАС

ПІНСК. (Кар. «Звязды»). У Іванаўскім раёне, у вёсцы Нікіцк Псышчэўскага сельсавета арганізаваўся новы калгас імені XVIII партыйнай канферэнцыі. У яго ўступілі 23 гаспадаркі.

Новыя члены сельгасарцелі разгарнулі дзейную падрыхтоўку да веснавой сяўбы: ачышчаюць насенне, рамантуюць сельскагаспадарчы інвентар.

АГРАТЭХНІЧНАЯ ВУЧОБА КАЛГАСНАГА АКТЫВА

Ва ўсіх 17 сельсоветах Бярэзінскага раёна арганізаваны кароткатэрміновыя агратэхнічныя курсы для калгаснага актыва. На курсах вучыцца звыш 700 чалавек—старшыні калгасаў, брыгадзіры паляводчых брыгад, звеннявыя, загадчыкі жывёлагадоўчых ферм. Чытаюць лекцыі аграномы і зоавэтработнікі, майстры высокіх ураджаяў і прадуктыўнасці жывёлагадоўлі — удзельнікі Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі.

Змястоўныя лекцыі для калгаснага актыва прачыталі аграном райземаддзела т. Стрэльскі, старшы зоатэхнік т. Міхальчук, аграном па кок-сагызу т. Карніенка, аграном Вялікі-Борскай МТС т. Літвіненка. За першыя дні прачытаны лекцыі на тэмы: «Задачы развіцця сельскай гаспадаркі раёна», «Аб спосабах апрацоўкі глебы», «Значэнне высокаякаснага насення ў падняцці ўраджайнасці», «Развіццё грамадскай жывёлагадоўлі і паленшанне яе прадуктыўнасці», «Правільнае кармленне жывёлы».

Заняткі праводзяцца тры разы ў месяц. Вучоба на кароткатэрміновых курсах будзе закончана 1 красавіка.

ВАЛАДАРЦЫ ПАДТРЫМЛІВАЮЦЬ ЗАКЛІК КРАСІНЦАЎ

З велізарнай увагай мы прачыталі і абмеркавалі адкрытае пісьмо калгаснікаў сельгасарцелі імені Красіна, Слуцкага раёна, Мінскай вобласці, у якім яны заклікаюць усе калгасы Совецкай Беларусі паследаваць іх прыкладу і смялей узяцца за складанне перспектыўных планаў у калгасах. Мы горача адабраем і падтрымліваем ініцыятыву красінцаў.

За апошнія годы наш калгас атрымаў новыя буйныя перамогі.

Плады сваёй работы мы бачым у багатых ураджаях, якія былі не пад сілу дробным аднаасобным гаспадаркам, у асваенні раней закінутых зямель, у росце грамадскай жывёлагадоўлі, ва ўсебаковым развіцці нашай арцельнай гаспадаркі. Асабліва значных поспехаў дасягнуў наш калгас у 1940 годзе. Не гледзячы на неспрыяючыя метэаралагічныя ўмовы мінулага года, мы атрымалі больш высокія ўраджаі, чым у 1938—1939 гадах. Сярэдні ўраджай зернавых культур з плошчы ў 153 гектары склаў у 1940 годзе 20,83 цэнтнера з гектара, у тым ліку азімага жыта — 26,38 цэнтнера з гектара. Сярэдні ўраджай зернавых культур за апошнія чатыры годы склаў 16,65 цэнтнера, ільновалакна—5,91 цэнтнера з гектара.

Значна павялічылася ў нас пагалоўе жывёлы. У калгасе ёсць 5 жывёлагадоўчых ферм і пчолапасека. Павысілася прадуктыўнасць жывёлы. Валавы даход за апошнія чатыры годы вырас больш чым у тры разы — з 146.901 руб. у 1937 годзе да 450 тыс. рублёў у 1940 годзе. Больш чым у два з палавінай раза выраслі грашовыя даходы калгаса. Калгаснікі жывуць заможным, шчаслівым жыццём. У 1940 годзе калгаснікам выдана на працадзень: грошай па 3 р. 50 к., зярна — па 3 кгр., бульбы — па 8 кгр., гародніны — па 1,5 кгр. і грубых кармоў — па 2 кгр.

На новую ступень узнята ў калгасе культура. У нас ёсць клуб, дзіцячыя яслі, у калгасных дамах гараць лямпачкі Ільіча. У 70 процантах калгасных двароў пасаджаны пладовыя дрэвы па 15—20 штук. Кожны калгасны двор забяспечан высокаякаснай вадой. У калгасным сяле пабудавана 6 водаразборных калонак гарадскога тыпу.

Для таго каб найбольш паспяхова выканаць пастаўленыя перад намі партыяй і урадам задачы, мы, па прыкладу калгаснікаў калгаса імені Красіна, прышлі да адзінай думкі аб неабходнасці скласці перспектыўны план развіцця нашага калгаса. У гэтым плане, ужо складзеным праўленнем калгаса пры дапамозе спецыялістаў, мы паставілі перад сабой задачу — праз 5—7 год мець па калгасу наступныя вытворчыя паказальнікі.

Давесці ўраджайнасць зернавых культур да 32—33 цэнтнераў з гектара, бульбы — да 300 цэнтнераў, сена шматгадовых траў — да 50—55 цэнтнераў, насення шматгадовых траў — да 3 цэнтнераў з гектара; распырыць плошчу штучных пасбішчаў да 65 гектараў; павялічыць плошчу грамадскіх агародаў з 13 гектараў да 40,5 гектара; плошчу саду — да 28 гектараў. Пагалоўе буйнай рагатай жывёлы павялічыць у два разы, у тым ліку кароў у 2,5 раза супроць устаноўленага мінімума; падвоіць удой малака на кожную карову, давёўшы яго да 4000 літраў у год супроць 1984 літраў у 1940 годзе; давесці выхад дзелавых парасят да 20 галоў на кожную свінаматку; настрыг шэрсці — да 5 кгр. у год на кожную дарослую авечку; яйцаноснасць курэй — да 150—170 яек у год; павялічыць пагалоўе жывёлы: свінаматак да 16 галоў супроць 10 галоў, авечак да 140 галоў супроць 70, курэй да 500 штук супроць 150 у сучасны момант; распырыць пчолапасеку з 10 да 50 пчоласямей; арганізаваць у 1941 г. рыбную гаспадарку і гусіную ферму на прудзе плошчай у 4,4 гектара; пабудаваць млын, пры якім абсталяваць станкі для рэзкі дошак, і воўначоску; валавую прадукцыю павялічыць у 3,7 раза.

Пры дасягненні пералічаных вытворчых паказальнікаў узрасце і заможнасць калгаснікаў. Аплата працадня дасягне: грашыма 13—14 рублёў, зярном—4 кгр., бульбай і гародніной — 13 кгр.

Вось якія зусім рэальныя магчымасці тояцца ў нашым калгасе, якія найбольш поўна могуць быць выкарыстаны, дзякуючы перспектыўнаму плану. Яны, гэтыя магчымасці, тояцца ў кожным калгасе нашай рэспублікі і планавае выкарыстоўванне іх з'яўляецца важнейшай задачай.

На працяту пяцігодкі мы намецілі правесці наступныя мерапрыемствы па будаўніцтву і ўпарадкаванню вёскі: пабудаваць лазню, даабсталяваць клуб, дзіцячыя яслі, пабудаваць свінарнік, канюшню, цялятнік, гноехавальнік, жыжазборнік; на скотным двары. МТФ пабудаваць падлогу і перавесці жывёлу на бязпоўнае ўтрыманне, наладзіць электрадаенне кароў; у 1941—1942 годах азеляніць усе калгасныя вуліцы з абодвух бакоў; на тых сядзібах калгаснікаў, дзе няма пладовых дрэў, пасадзіць іх у 1941 годзе. Дабіцца, каб каля кожнага калгаснага дома былі палісаднікі і кветнікі. Паставіць дадаткова 3 водаразборныя калонкі, прыступіць да аштукатуркі і пабелкі сцен дамоў калгаснікаў.

Мы глыбока ўпэўнены, што ўсе намечаныя намі ў перспектыўным плане развіцця нашага калгаса мерапрыемствы будуць поўнасцю выкананы.

Па даручэнню агульнага схода калгаснікаў ордэна Леніна сельгасарцелі ім. Валадарскага, Магілёўскага раёна:

Старшыня калгаса ордэнаносец І. КАРАКІН.

Брыгадзіры: Н. ЦЫГАНКОЎ, Д. ЛЯГУШАЎ.

Заг. МТФ І. ЦЫГАНКОЎ.

Заг. хаты-лабараторыі І. ХАУСТАЎ.

Агароднік Н. АКСЕЛЬРОД.

Звеннявыя: І. ШУТАЎ, І. НОВІКАЎ.

Калгаснікі: П. ЦЫКУНОЎ, П. КУБЛІЦКІ, С. КАРДЗЯНКОЎ.

ЗА РУБЯЖОМ

Вайна ў Еўропе і Афрыцы

(ДЗЁННІК ВАЕННЫХ ДЗЕЯННЯЎ)

7 сакавіка на албанскім фронце прадаўжаліся баі мясцовага характару. Грэчаскія войскі прадпрынялі паспяховую атаку ў цэнтральным сектары фронта. Як паведамляе вярхоўнае камандаванне грэчаскай арміі, грэчаскія войскі, выцеснёўшы італьянцаў з сільна ўмацаваных пазіцый, захапілі 1.050 палонных, у тым ліку некалькі афіцэраў. Захоплена таксама многа зброі.

Італьянская авіяцыя, паводле паведамлення вярхоўнага камандавання італьянскай арміі, падвергла бамбардыроўцы скапленні грэчаскіх войск і абарончыя збудаванні праціўніка.

Ва ўсходняй частцы Міжземнага мора злучэнні германскіх пікіруючых бамбардыроўшчыкаў падверглі, як адзначаецца ў германскай зводцы, бамбардыроўцы ваенныя збудаванні на востраве Мальта. У рэзультаце бамбардыроўкі ўзнік вялікі пажар.

***

У Паўночнай Афрыцы, паведамляецца ў італьянскай зводцы, англійскія войскі атакавалі ўмацаваны аазіс Джарабуб. Атака была адбіта. Італьянскія самалёты падвергалі бамбардыроўцы порт Бенгазі, адну паветраную базу і калону мотамеханізаваных часцей англічан.

***

Ва Ўсходняй Афрыцы, у Абісініі, прадаўжаюцца паспяховыя дзеянні партызан, якія, як паведамляе агенцтва Рэйтэр, знаходзяцца за восем міль на ўсход ад Бурыэ. Наступленне на Адыс-Абебу вядзецца зараз у 12 напрамках. Атрады партызан дзейнічаюць разам з англійскімі войскамі ў раёне Чыльга (на дарозе ў Гандар).

У Італьянскім Самалі, паводле камунікэ англійскага камандавання на Блізкім Усходзе, англійскія атрады прасоўваюцца ўздоўж галоўнай дароги, што вядзе ад Магадышо да Джыг-Джыге (Абісінія).

У Эрытрэі адбываліся ажыўленыя дзеянні авіяцыі. Англійскія самалёты, гаворыцца ў італьянскай зводцы, зрабілі паветраныя налёты на некалькі пунктаў. У раёне Керэна, згодна англійскай зводкі, англійскія самалёты бамбардыравалі італьянскія пазіцыі, аўтатранспарт, а таксама перакрыжаванні дарог і чыгуначную лінію. У Асмары бамбардыроўцы падвергліся вясінныя склады.

***

На англійскім фронце адзначаецца актыўнасць германскіх узброеных сіл. 7 сакавіка, гаворыцца ў германскай зводцы, атакі адзінкавых германскіх бамбардыроўшчыкаў былі накіраваны супроць аэрадромаў у Паўднёвай і Цэнтральнай Англіі. Прычынены значныя пашкоджанні ангарам і казармам. Бамбардыроўцы падвергліся таксама ваенныя заводы паблізу Нью-Арк і Брыстоля.

Германскія тарпедныя кацеры атакавалі ля паўднёва-ўсходняга ўзбярэжжа Англіі канвайруемыя караваны суднаў англічан і затапілі два англійскія эсмінцы і пэсць узброеных гандлёвых суднаў.

Англійская авіяцыя, як паведамляе агенцтва Рэйтэр, падвергла бамбардыроўцы ваенна-марскі порт Хельдэр і адзін з акупіраваных немцамі аэрадромаў. Самалёты бераговай абароны затапілі ля галандскага ўзбярэжжа германскі грузавы параход.

8 сакавіка (ТАСС).

Дзеянні германскай авіяцыі

БЕРЛІН, 8 сакавіка. (ТАСС). Згодна паведамлення германскага інфармацыйнага бюро, германскія пікіруючыя бамбардыроўшчыкі скінулі некалькі бомб на ваенны склад на востраве Мальце. Склад загарэўся. Бамбардыроўцы былі падвергнуты таксама партовыя збудаванні і доки Ла Валеты, а таксама пражэктарныя ўстаноўкі.

Германскія бамбардыроўшчыкі з поспехам атакавалі ўчора сем англійскіх аэрадромаў. Адзначаны попаданні бомб у ангары і казармы.

Адзін непрыяцельскі гандлёвы параход танажам у 1.200 рэгістравых брута-тон быў затоплен на паўднёвым усходзе ад Блактон-Оп-Сі. Другі гандлёвы параход танажам у 4.000 рэгістравых брута-тон быў вельмі пашкоджан скінутымі на яго бомбамі. Гандлёвы параход танажам у 1.200 рэгістравых брута-тон, які падвергся атацы з брыючага палёту, атрымаў пашкоджанні. Былі скінуты бомбы на завод шарыкападшыпнікаў. Адзначаны попаданні ў цэхі завода, у якіх адбыліся вялікай сілы выбухі.

Амерыканская дапамога англійскаму суднаходству

ВАШЫНГТОН, 8 сакавіка. (ТАСС). Выступаючы ў камісіі па марскіх справах палаты прадстаўнікоў у час абмеркавання законапраекта, прадугледжваючага будаванне дапаможных суднаў для ваенна-марскога флота агульным водазмяшчэннем у 200 тыс. тон, намочнік начальніка аператыўнага аддзела марскога міністэрства адмірал Інтерсол заявіў, што пытанне аб тым, якім чынам будуць скарыстаны гэтыя судны, яшчэ не вырашана. Інтерсол указаў, аднак, што частка новых дапаможных суднаў будзе ў адпаведнасці з праграмай, прадугледжанай законапраектам аб перадачы ў пазыку або ў арэнду ўзбраення, прадастаўлена Англіі.

У артыкуле, распаўсюджаным агенцтвам Юнайтэд Прэс, адстаўны адмірал Стырлінг заяўляе, што германскія атакі на англійскае суднаходства робяцца ўсё больш сур'ёзнымі. За апошнія некалькі тыдняў немцы затапілі 25 проц. амерыканскіх грузаў, якія адпраўляліся ў Англію. У сучасны момант англійскія страты ў суднаходстве складаюць у сярэднім каля 70 тыс. тон у тыдзень.

Ваенная падрыхтоўка ў Індыі

ЛОНДАН, 8 сакавіка. (ТАСС). Як паведамляе карэспандэнт агенцтва Рэйтэр з Дэлі, совет пры віцэ-каралю аднагалосна адобрыў прапанову камандуючага ўзброенымі сіламі Індыі генерала Окінлек расшырыць кантынгент асоб, прызываемых у індыйскую армію. З гэтай мэтай совет рэкамендуе ваенным уладам заняцца вывучэннем пытання аб людскіх рэсурсах краіны, не выключаючы пры гэтым ніякіх груп насельніцтва і ніякіх раёнаў.

Пасылка асабістага прадстаўніка Рузвельта у Англію

ВАШЫНГТОН, 8 сакавіка. (ТАСС). Белы дом (рэзіденцыя Рузвельта) аб'явіў, што член камітэта нацыянальнай абароны фінансіст Гарыман выязджае ў Лондан у якасці асабістага прадстаўніка Рузвельта «па ўсіх пытаннях, маючых адносіны да аказання матэрыяльнай дапамогі Брытанскай імперыі». Гарыман вылятае ў Лондан 10 сакавіка. У Белым доме заявілі таксама, што ў бліжэйшы час у Лондан выедуць уладавы эксперт па пытаннях авіяцыі Уорнер і дарадца ваеннага міністэрства палкоўнік Грын, якія будуць дапамагаць Гарыману ў яго місіі.



Пераданая моладзь сталіцы БССР без адрыву ад вытворчасці вывучае лётную справу ў Мінскім аэраклубе імені Молакава. На здымку: выдатнікі вучобы комсамольцы В. Лісевіч (друкар друкарні імені Сталіна) і А. Маркоўка (рабочы сталовай адной з пабудоў) за самападрыхтоўкай па вывучэнню матэрыяльнай часткі матора М-11.

Фото А. Панькова. (БЕЛТА).

У ГАРАДСКОЙ КАМІСІІ ПА БАРАЦЬБЕ З ПАВОДКАЙ

У гутарцы з работнікам «Звязды» старшыня Мінскай гарадской камісіі па барацьбе з паводкай тав. Гарабцоў Б. І. паведаміў.

У горадзе заканчваецца зараз улік жылых і комунальных памяшканняў, якія знаходзяцца ў нізкіх месцах. Большасць мастоў ужо ўмацаваны. Ля іх устанаўліваюцца пражэктары. Да раённых троек па барацьбе з паводкай прымацаваны 20 пажарных дружын прадпрыемстваў горада, а таксама машыны для адкачвання вады і 46 лодак. Створана спецыяльная падрыўная каманда. Яна будзе зрываць лёд ля мастоў і ў асаблівасці ў раёне возера.

Рад мерапрыемстваў намеціў Мінгорасвод. Ім створаны 11 дружын, у якія ўваходзяць звыш 300 актывістаў асвядамляючых—рабочых і служачых прадпрыемстваў, фізкультурнікаў і іншых. Арганізоўваюцца аварыйныя лёгкавадалазныя каманды. Яны забяспечваюцца неабходным выратавальным інвентаром—кругамі, шарамі і т. д.

Аднак трэба адзначыць, што многія кіраўнікі прадпрыемстваў і домаўпраўленняў да гэтага часу не прымаюць дастатковых мер да аховы соцыялістычнай маемасці ад паводкі. Да іх адносяцца дырэктар млына імені Дзержынскага т. Пярчынскі, дырэктыя дражджавога завода «Чырвоная зара». Яшчэ поўнасцю не закончана работа па ачышчэнню ракі ад захоўваючыхся там бочак з салёнымі гуркамі, памідорамі. Дырэктар трэста кафэ і рэстаранаў т. Мяловы марудзіць з гэтай справай.

Не прымае меры нерасцярогі і дырэктар электрастанцыі № 1 т. Рак. Тут яшчэ нават не пабудован латок для адводу вады і не ўстаноўлены помпы для адкачвання вады.

Народны камісарыят комунальнай гаспадаркі БССР да гэтага часу не выдзеліў матэрыялаў для пабудовы дамбы ля электрастанцыі і для асвятлення асобных мастоў і плашчы ля возера.

ПАПРАЎКА

У апублікаваным тэксце прынятага Вярхоўным Советам СССР на VIII сесіі «Закона аб падаходным падатку з калгасаў» (надрукавана ў газеце «Звязда» ад 5 сакавіка) у раздзеле IV закона, у другім абзацы артыкула 10 дапушчана памылка: надрукавана: «з моманту **вылічэння** апошняга тэрміна ўплаты», трэба чытаць: «з моманту **скančэння** апошняга тэрміна ўплаты».

(БЕЛТА).

Маленькі фельетон

ДЗІЎНАЕ ПЕРАЎВАСАБЛЕННЕ

Гавораць, што майстэрства пераўвасаблення—вялікае майстэрства. Не будзем спрачацца. Магчыма гэта сапраўды так. Але важна, якімі сродкамі дасягаецца яно.

Калі артыст Нікалай Чаркасаў у фільме «Дэпутат Балтыкі» бліскуча іграе ролю 75-гадовага прафесара Палежаева, а ў фільме «Пётр першы» іграе ролю малодога Аляксея—гэта зразумела. Тут выяўлен талент артыста, яго творчы дыяпазон. Гэта — майстэрства пераўвасаблення.

Але як ацаніць такі факт, калі па аднаму ўзмаху рукі чалавек перастае быць тым, кім ён быў, пераўвасабляецца тут-жа на месцы, без адрыву ад займаемай пасады?

У нас пытаюць:

— Кіраўнік установы хоча павялічыць работніку стаўку зарплаты, а зацверджаны штатны расклад не дазваляе гэтага. Што рабіць?

Адказваем:

— Трэба гэтага работніка неадкладна зняць з работы, і тады сама сабой павялічыцца стаўка яго зарплаты.

За жыццёвасць і правільнасць гэтага метада ручаемся. Даем пісьмовую гарантыю ў поўным поспеху. Мы гатовы даказаць эфектнасць гэтага адкрыцця на любой павуковай сесіі.

Павінны толькі аставрыцца: патэнт на гэта вынаходства трэба выдаць не нам, а кіраўнікам Наркомгаса БССР.

Іх адкрыццё —іх слава.

Мы-ж бяром на сябе скромную ролю папулярызатараў.

Паводле рашэння ўрада, у наркаматах і іншых установах павінна было быць праведзена скарачэнне ўпраўленчага апарата. Сапраўды, у некаторых установах штаты да таго раздуты, што яны ўжо не ўмяшчаюцца ў займаемых установамі будынках.

Народны камісарыят комунальнай гаспадаркі БССР, вядома, не мог аставацца ў баку ад гэтага важнага мерапрыемства. А калі-б ён і хацеў астацца ў баку, дык Наркамфін не дазволіў-бы.

І вось, пачалося скарачэнне апарата.

Можна было зрабіць гэта даволі проста, — аслабаніць лішніх людзей. Але-ж гэта будзе звычайна, як і ўсюды. Якая тады будзе арыгінальнасць? Дзе палёт творчай мыслі?

Як-жа зволіць работніка па скарачэнню штата, калі не хочацца яго звальняць? Ці нельга зрабіць так, каб лічыць яго зволеным і каб ён разам з тым астаўся на месцы, з той толькі розніцай, што яму будзе павялічана стаўка зарплаты.

Такое рашэнне было прынята ў Наркомгасе. І яно поўнасцю ажыццёўлена.

І пачалося вялікае пераўвасабленне...

Яніна займала пасаду эканаміста па будаўніцтву. Аклад — 400 рублёў у месяц. Яе аслабанілі па скарачэнню штатаў і заадно павялічылі зарплату да 450 рублёў. Скарочаная Яніна прадаўжае працаваць на ранейшай рабоце. Толькі яна ўжо не тая Яніна: яна цяпер лічыцца не эканамістам, а інжынерам па інвентарызацыі.

Такім чынам, апарат наркамата зменшыўся яшчэ на адну штатную адзінку.

Кроль займала пасаду эканаміста і атрымлівала 450 рублёў у месяц.

Яе аслабанілі па скарачэнню штатаў і, натуральна, давялі аклад яе да 500 рублёў.

Яна прадаўжае працаваць на той-жа пасадзе, толькі, чамусьці, называецца старшым інжынерам, хоць тэхнічнай асветы не мае і інжынерам не працуе.

Такім чынам, апарат наркамата зменшыўся яшчэ на адну штатную адзінку.

Цудоўнае пераўвасабленне адбылося і з старшым эканамістам — Язвінскай. Сядзела яна спакойна, працавала і атрымлівала рэгулярна 500 рублёў у месяц, пакуль яе не зволілі па скарачэнню штатаў. І паколькі яе скарацілі, яна заслужыла права на павелічэнне зарплаты. А раз заслужыла, то павінна атрымліваць. І атрымлівае 550 рублёў у месяц. На самай справе, калі ўжо быць скарочанай па штату, то па крайняй меры з некаторымі матэрыяльнымі выгадамі.

Такім чынам, апарат наркамата зменшыўся яшчэ на адну штатную адзінку.

Хто цяпер скажа, што ў Наркомгасе БССР не скарацілі апарат?

Паехаў работнік наркамата Такапула ў Баранавічы ў камандыроўку. Прыехаў, устроіўся ў гасцініцы і жыве. Жыве і ажыццяўляе канкрэтнае кіраўніцтва добкомгасам. А за кіраўніцтва трэба плаціць грошы. І облкомгас плаціць Такапуле за час яго прабывання ў горадзе 3.000 рублёў. І Наркомгас плаціць за тэты час зарплату, камандыровачныя, сутачныя. Як-жа інакш? Адна справа, калі чалавек сядзіць у Мінску ў апараце наркамата— ён тады атрымлівае зарплату толькі ў наркамаце. А калі ён выехаў у камандыроўку і абследуе ўстанову, падведамственную наркамату. — ён і там павінен атрымліваць зарплату.

А інспектар Наркомгаса — Яцэнчук сядзіць сабе ў Мінску, атрымлівае зарплату, загадвае курсавой базай у Баранавічах і таксама атрымлівае за гэта салідную суму...

Цяпер можна смела сцвярджаць, што кіраўнікі Наркомгаса БССР сказалі новае слова, зрабілі нямалаважнае адкрыццё ў галіне пераўвасаблення.

Іх адкрыццё — іх слава.

С. КУНЯЎСКІ.

На рэках рэспублікі

Наступіўшае пацяпленне выклікала пад'ём узроўню вады на рэках Нёман з прытокамі і Заходні Буг з прытокамі. Апрача таго пад'ём вады назіраецца на паўднёвых і паўночных прытоках Прыпяці, працякаючых па Брэсцкай, Пінскай і паўднёвай частцы Палескай абласцей.

За 8 дзён сакавіка ўзровень вады ў рацэ Нёман павялічыўся ля горада Белицы на 70 сантыметраў, ля горада Гродна на 260 сантыметраў.

На рацэ Мухавец ля горада Брэста ўзровень вады 8 сакавіка дасягнуў 358 сантыметраў, тады як звычайна веснавы максімальны ўзровень вады даходзіць да 300 сантыметраў. Далейшы пад'ём вады прадаўжаецца.

На рэках Заходняя Дзвіна, Дняпр, Бярэзіна і Сож назіраецца нязначны пад'ём вады—да 2—3 сантыметраў у суткі. Гэтыя рэкі яшчэ скаваны ільдом, які паступова пачынае цямнець і разбурацца.

Ускрыліся рэкі Нарэў, Піна, на якіх ідзе лёдаход.

На рацэ Свіслач ля вёскі Зарэчча (у 15 кілометрах вышэй гор. Мінска) узровень вады за апошнія суткі вырас на 14 сантыметраў. 8 сакавіка ля вёскі Зарэчча заўважаўся слабы лёдаход. На астатняй частцы ракі Свіслач лёд тае на месцы пры вельмі нязначным (1 см. у суткі) павышэнні ўзроўню.

ШАХМАТЫ

ВУЧЭБНЫ КОНКУРС № 2



Белыя пачынаюць і выйграюць.

Тэрмін адсылкі рашэнняў праз 10 дзён.

Прыведзенае заданне зазяўляецца таксама заданнем на матыў мата на апошняй гарызанталі. Мы ўжо адзначалі («Звязда», 2 сакавіка), што мат на апошняй гарызанталі сам па сабе элементарны, што, аднак, не перашкаджае стварэнню самых складаных камбінацый. На прыкладзе камбінацый на гэты матыў можна зразумець усю дынаміку шахматнай ігры, у прыватнасці — якімі метадамі дасягаецца перавага сіл у рашаючым пункце (прыцягненне новых сіл, адцягненне непрыяцельскіх і т. д.).

ЦІКАВАЯ ПРАПАНОВА

Шахматная секцыя клуба імені Тэльмана (гарадскі пасёлак Узда, Мінскай вобласці) прыслала ў рэдакцыю цікавую прапанову арганізаваць па Мінскай вобласці міжраённы шахматны матч-турнір па перапісцы.

Шахматныя секцыі раённых цэнтраў, якія пажадаюць прыняць удзел у такім турніры, могуць паслаць заяўкі ў рэдакцыю «Звязды» ці ў аблкамітэт на справах фізкультуры і спорта (Мінск, плошча Свабоды).

Практыка ігры па перапісцы, асабліва калектыўнай, вельмі карысна для павышэння кваліфікацыі ўсіх іграчых, і таму ініцыятыву шахматыстаў гарадскога пасёлка Узда трэба было-б распаўсюдзіць і па іншых абласцях.

У РЭСПУБЛІКАНСКІМ КАМІТЭЦЕ ПА СПРАВАХ ФІЗКУЛЬТУРЫ І СПОРТА

◎ Камітэт па справах фізкультуры і спорта пры СНК Літоўскай ССР прапанаваў арганізаваць таварыскія сустрэчы шахматыстаў брацкіх рэспублік. Беларускі рэспубліканскі камітэт арганізуе першую такую сустрэчу ў г. Мінску 13—14 сакавіка на 10 дошках.

◎ Шахматны чэмпіянат БССР будзе праведзен у горадзе Мінску і пачнецца зараз-жа пасля матча з Літоўскай ССР. У чэмпіянаце прымуць удзел майстры: Верасаў (Мінск), Сіліч (Віцебск) і 14 мацнейшых шахматыстаў першай катэгорыі — пераможцаў абласных чэмпіянатаў і поўфінала, праведзенага ў Беластоку ў 1940 годзе.

◎ Шашачны чэмпіянат рэспублікі пачнецца ў Мінску 20 красавіка. У ім прымуць удзел майстар Гардон, чэмпіён БССР тав. Грушэцкі (Віцебск).

Зацверджаны раней састаў будзе некалькі пашыран за лік лепшых шашыстаў, паказаўшых добрыя поспехі ў апошніх турнірах (Мінск, Віцебск).

◎ Жаночыя шахматны і шашачны чэмпіянаты рэспублікі адбудуцца ў лютым. У іх прымуць удзел чэмпіёнкі гарадоў БССР. Аднак да гэтага часу няма вестак аб арганізацыі чэмпіянатаў нават у буйнейшых гарадах рэспублікі (Мінск, Віцебск, Гомель).

Актывісткам і любіцельніцам шахматнай і шашачнай ігры неабходна больш інициятыўна ўзняцца за арганізацыю гарадскіх чэмпіянатаў і ўздзейнічаць у гэтым на камітэты па справах фізкультуры і спорта.

ХОД ВЫКАНАННЯ ПЛАНА ЗАГАТОВАК І ВЫВАЗКІ ДРАЎНІНЫ ПА АБЛАСЦЯХ РЭСПУБЛІКІ З 23 СТУДЗЕНЯ ПА 5 САКАВІКА 1941 г

(у тысячах кубаметраў)

ОБЛАСЦІ	ЗАГАТОЎКІ		ВЫВАЗКІ	
	План	Процант выканання	План	Процант выканання
Баранавіцкая	795	94,9	891	82,0
Беластоцкая	635	94,6	711	79,5
Брэсцкая	700	87,1	711	71,8
Відзейская	465	100,9	561	88,8
Віцебская	555	71,8	511	69,5
Гомельская	440	62,0	371	60,9
Мінская	705	83,6	661	71,9
Магілёўская	820	71,2	661	66,2
Пінская	780	68,7	910	61,5
Палеская	805	76,0	632	77,8
Усяго	**6.700**	**81,0**	**6.620**	**73,3**

Адказны рэдактар Т. С. ГАРБУНОЎ.

Першы Беларускі дзяржаўны ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга драматычны тэатр

9 сакавіка

ДУРА ДЛЯ ІНШЫХ, РАЗУМНАЯ ДЛЯ СЯБЕ

Пачатак у 8 г. 30 м. веч.

Цэны на білеты зніжаны.

Дзяржаўны Яўрэйскі тэатр БССР

9 сакавіка раніцай «А КРУМЕР ШЫДЭХ»

Пачатак у 12 г. дня;

вечарам «СЭРКЕЛЭ»

Пачатак у 8 г. 30 м. веч.

10 сакавіка «А КРУМЕР ШЫДЭХ»

Пачатак у 8 г. 30 м. веч.

АКРУГОВЫ ТЭАТР ЧЫРВОНАЙ АРМІІ ЗАХАВА

(Мінскі Дом Чырвонай Арміі)

ГАСТРОЛІ СМАЛЕНСКАГА ДРАМАТЫЧНАГА ТЭАТРА

9 сакавіка раніцай і вечарам «АННА КАРЕНИНА»

Пачатак у 12 г. дня і 8.30 вечара.

ДЗЯРЖАЎНЫ ОРДЭНА ЛЕНІНА ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА БССР

9 сакавіка

ПІКАВАЯ ДАМА

Опера ў 7 карцінах. Музыка Чайкоўскага.

Партыю Германа выконвае народны артыст РСФСР, саліст Маскоўскага ордэна Леніна Акадэмічнага Вялікага тэатра

Н. Н. ОЗЕРАЎ

Пачатак у 8 гадзін 30 мінут вечара.

Кінотэатр «Чырвоная зорка» «ВЕСЕННИЙ ПОТОК» Сеансы: 6, 7.30, 9.15 і 11.

Кінотэатр «Родина» САЛАВАТ ЮЛАЕЎ Сеансы: 6, 7.45, 9.20 і 11.

Кінотэатр «Інтэрнацыянал» СТАНІЦА ДАЛЬНЯЯ

Дзіцячы кінотэатр Дзённыя сеансы «ПЕТР ПЕРВЫЙ» Вячэрнія сеансы для дарослых «ПЕТР ПЕРВЫЙ»

Кіно «Навіны дня» (б. «Спартак») 1 Сабака на вайне (навукова-папулярны фільм). 2. Працоўныя рэзервы (кінанарыс). 3. Саюзкінажурнал № 17.

БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ФІЛАРМОНІЯ (памяшканне клуба ім. Сталіна)

10 сакавіка КАНЦЭРТ юнага дырыжора 13-гадовай

Ніны ХЕЙФЕЦ

(Ленінград).

Адкрыт папярэдні продаж білетаў у касе клуба з 2 да 9 гадзін веч.

У МАГАЗІНЫ МІНГОРПРОМГАНДЛЯ ДА ВЯСЕННЕ-ЛЕТНЯГА СЕЗОНА

паступіў у продаж

ВЯЛІКІ АСАРТЫМЕНТ ЛЕТНІХ ЖАНОЧЫХ ШОЎКАВЫХ, БАВАЎНЯНЫХ, ІЛЬНЯНЫХ СТРОЧНА-ВЫШЫВАНЫХ ПЛАЦЦЯЎ І БЛУЗАК

З ВЕРХНЯГА АДЗЕННЯ ПАСТУПІЛІ ДЭМІСЕЗОННЫЯ МУЖЧЫНСКІЯ ПАЛІТО, БРУКІ, ГІМНАСЦЁРКІ і т. д.

ЁСЦЬ У ПРОДАЖЫ ПРЫГОЖЫЯ ВЕРХНІЯ МУЖЧЫНСКІЯ КАШУЛІ РОЗНЫХ ФАСОНАЎ

БАГАТЫ АСАРТЫМЕНТ ДЗІЦЯЧАГА АДЗЕННЯ: ПАЛІТО, КАСЦЮМЧЫКАЎ, ПЛАЦЦЯЎ, ПІОНЕРСКІХ КАСЦЮМАЎ, ДЗІЦЯЧАЙ БЯЛІЗНЫ, АБУТКУ і т. д.

У МАГАЗІНЫ БУДМАТЭРЫЯЛАЎ пастуцілі ў продаж ДАХАВАЯ ЧАРАПІЦА, белыя і зялёныя КАФЛІ.

ПАСУДА - ГАСПАДАРЧЫЯ МАГАЗІНЫ АТРЫМАЛІ ПЕРШУЮ ПАРТЫЮ КЕРАГАЗАЎ.

Магазіны адкрыты з 10 гадзін раніцы да 8 гадзін вечара.

МІНГОРПРОМГАНДАЛЬ.

ДА ЎВАГІ КАЛГАСАЎ

Упраўленне Дзяржстраха НКФ БССР

даводзіць да ведама праўленняў калгасаў

Віцебскай, Гомельскай, Мінскай, Магілёўскай і Палескай абласцей Беларускай ССР, што зараз раённыя інспекцыі Дзяржстраха

ПРАВОДЗЯЦЬ

дабравольнае звышакладное страхаванне

яравых пасеваў

СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ КУЛЬТУР 1941 года.

Яравыя пасевы сельскагаспадарчых культур можна страхаваць да пасеву ад градабіцця, ліўняў, бур, агню на корні, вымачкі, вымярзання, выправання, замаразкаў і паводкі.

Пасевы махоркі, канатніка і іншых спецыяльных культур, апрача таго, страхуюцца ад засухі.

Пасля сканчэння тэрмінаў сяўбы пасевы прымаюцца на страхаванне толькі ад градабіцця, ліўняў, бур і агню.

Адначасова можна страхаваць АЗІМЫЯ ПАСЕВЫ 1940 г. таксама ад градабіцця, ліўняў, бур і агню, калі яны яшчэ не застрахаваны.

Пасевы прымаюцца на страхаванне да поўнага кошту планавага ўраджаю.

КАЛГАСЫ, СТРАХУЙЦЕ СВАЕ ПАСЕВЫ ПА ДАБРАВОЛЬНАМУ СТРАХАВАННЮ!

Для заключэння страхавання звяртайцеся да ўчастковых інспектараў або да агентаў Дзяржстраха.

УПРАЎЛЕННЕ ДЗЯРЖСТРАХА НКФ БССР.

ВЫДАВЕЦТВУ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА» патрэбны пакоі (часова) ДЛЯ ЖУРНАЛІСТАЎ

Аплата па згодзе.

З прапановамі звяртацца па адрасу: Совецкая, 49 другі паверх, пакой № 6, або па тэлефону № 21-358.

АРЦЕЛІ «ЧЫРВОНЫ МЕТАЛІСТ» ПАТРАБУЮЦЦА:

БЛЯХАРЫ, ТОКАРЫ, высокакваліфікаваныя СЛЁСАРЫ, КАВАЛІ, МАЛАТАБОЙЦЫ, НЕКВАЛІФІКАВАНЫЯ РАБОЧЫЯ для перакваліфікацыі.

Звяртацца: Мінск, Садовая 13-а; тэлефон 25-213 і 25-402.

ПРАГРАМЫ РАДЫЁПЕРАДАЧ

10 САКАВІКА, ПАНЯДЗЕЛАК

Ст. РВ-10

00.07—1. Эстрадны канцэрт. 2. Канцэрт папулярнай музыкі. 11.00—Лекцыя ў дапамогу вывучаючым марксізм-ленінізм: «Матэрыялістычная філасофія ў Расіі ў XVIII—XIX вяках» (1-я лекцыя). 17.05—Літ.-муз. перадача для піянераў і школьнікаў — «Тарас Грыгорэвіч Шэўчэнка». 18.00—Літ. перадача. Петрас Цвірка — «Светлы дом» (апавяданне). 18.15—Яўрэйскія народныя песні. 19.30—Перадача: «Дадзім краіне больш лесу». 20.00—Канцэрт балетнай музыкі. 20.25—Лекцыя ў дапамогу вывучаючым марксізм-ленінізм: «XVIII з'езд ВКП(б)». 21.05—Літ.-муз. перадача. Янка Купала — «Тарасава доля». 21.35—Сімфанічны канцэрт з твораў совецкіх кампазітараў.

Ст. РВ-95

18.15—Пазастудыйная перадача з Баранавіцкай школы ФЗА. 18.30—Канцэрт. Урыўкі з опер Паліашвілі. 21.05—Антырэлігійная гутарка на польскай мове: «Рэлігія — вораг разняволення жанчын».

11 САКАВІКА, АЎТОРАК

Ст. РВ-10

00.07—1. Літ. муз. перадача. Лермантаў — «Вадзім». 2. Канцэрт з твораў рускіх і совецкіх кампазітараў на тэксты Лермантава. 10.00—Перадача для дзяцей — «Жыццё школы». 10.10—Перадача для мал. школьнікаў. Белышаў — «Трыццаць тры жаданні» і «Казка пра падказку». 17.05—Навукова-папулярная перадача для піянераў і ст. школьнікаў: «Падарожжа ў краіну тэмператур». 17.45—Літ. перадача. Асеў — выбраныя вершы. 18.15—Канцэрт папулярнай музыкі. 19.30—Пазастудыйная перадача з калгаса «Першае мая». Слуцкага раёна, прысвечаная ажыццяўленню пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб дадатковай аплаце працы калгаснікаў за павышэнне ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур прадуктыўнасці жывёлагадоўлі на Беларускай ССР» і падрыхтоўцы да сяўбы. 21.05—Вечар, прысвечаны Т. Г. Шэўчэнка.

Ст. РВ-95

17.30—Літ. перадача на польск. мове. Урыўкі з твораў совецкіх пісьменнікаў. 18.15—Канцэрт рускай народнай музыкі. 21.05—Літ.-муз. перадача на яўрэйскай мове. М. Дзегцяр — «Пад дубам». 21.45—Музыкальная перадача— «Пушкін у сяле Міхайлаўскім».

12 САКАВІКА, СЕРАДА

Ст. РВ-10

00.07—1. Канцэрт папулярнай музыкі. 2. Песні і танцы народаў СССР. 11.00—Лекцыя ў дапамогу вывучаючым марксізм-ленінізм: Аб кнізе В. І. Леніна «Што такое «прыяцелі народа» і як яны ваююць супроць сацыял-дэмакратаў?». 17.05—Эстрадны канцэрт для малодшых школьнікаў. 18.00—Літ. перадача. Філіп Пестрак — выбраныя вершы. 18.15—Рускія народныя песні. 19.30—Канцэрт з цыкла «Развіццё заходне-еўрапейскага раманса». 20.00—Артыкул: «Да новага ўздыму прамысловасці і транспарта». 20.15—Перадача — «Па большэвіцку правядзем веснавую сяўбу». 20.30—Літ. перадача. Палевой— «Гарачы цэх». 21.05—Канцэрт з твораў Глінкі.

Ст. РВ-95

17.30—Перадача для дзяцей — «Жыццё школы». 18.15—Перадача на тэму: «Работа прадпрыемстваў мясцовай прамысловасці». 18.30—Канцэрт. 19.30—Канцэрт. Паказ выдатнікаў Мінскай музыкальнай школы.

РАШЭННЕМ ПРЭЗІДЫУМА ВЦСПС АД 1 ЛЮТАГА 1941 г. «АБ АБ'ЕДНАННІ ПРАФЕСІЯНАЛЬНЫХ САЮЗАЎ РАБОЧЫХ МТС З ПРОФСАЮЗАМ РАБОТНІКАЎ ЗЯМЕЛЬНЫХ ОРГАНАЎ»

Беларускі рэспубліканскі камітэт профсаюза работнікаў зямельных органаў

ліквідуецца

Арганізацыі і асобы, маючыя прэтэнзіі да БРК саюза работнікаў зямельных органаў, павінны прадставіць іх ДА 25 САКАВІКА 1941 г. па адрасу: г. Мінск, Совецкая вул., дом № 55, другі паверх, ліквідкому БРК саюза работнікаў зямельных органаў.

Пасля ўказанага тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца не будуць.

ЛІКВІДКОМ.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Мінск, Совецкая, 49. Тэлефоны рэдакцыі: адказны рэдактар—20-000 (камутатар), дадатковы—102, прыёмная рэдактара — 2-13-52, намеснік адказнага рэдактара — 2-51-68, адказнага сакратара — 2-13-53, намеснік адказнага сакратара — 2-13-29, сакратарыята — 2-39-55. Аддзелы: загадчык партыйнага аддзела — 2-13-46, літработнікаў — 2-13-56, загадчык аддзела прапаганды і агітацыі — 2-51-89, загадчык эканамічнага аддзела — 2-08-30, літработнікаў — 2-15-56, літработнікаў па літаратуры і мастацтву, школах, ваенна-фізкультурнай рабоце, унутранай інфармацыі — 2-13-85, аддзела рабселькораў і пісем працоўных — 2-13-60, бух. выдавецтва — 2-13-58, бухгалтэрыі выдавецтва і аддзела аб'яў — 2-08-44, выпускаючага — 2-47-68, карэктарскай — 2-13-37

У1716. Друкарня газеты «Звязда». Кр., Ш., Ш.